Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛЮТАГА 2017 г. ЧАЦВЕР № 27 (28391)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Звязда» дапамагла сям'і стаць шматдзетнай



Татуіроўка пасля складанай аперацыі



Мы не таварышы. І не спадары?

СТАР. 14

ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ЗАКРЭЎСКІ, намеснік міністра энергетыкі:**

*«У выніку выканання галіновай праграмы развіцця электраэнергетыкі на 2016—2020 гады плануецца ўвесці ў эксплуатацыю атамную станцыю. Мы разлічваем вывесці да 400 МВт неэфектыўных магутнасцяў і замяніць іх новымі. Плануецца замяшчэнне 2,5 млрд куб. м газу, у тым ліку за кошт уводу АЭС і будаўніцтва энергакрыніц на мясцовых відах паліва. Гэта дазволіць знізіць долю дамінуючага рэсурсу — прыроднага газу — у вытворчасці цеплавой і электраэнергіі да 70%, цяпер яна каля 90%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9225 | ▲ |
| Еўра | 2,0490 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0713 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

**СПАДЧЫНА Францыска Скарыны і 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, юбілеі класікаў літаратуры і найноўшыя выданні для дзяцей, даследаванні нашай культуры і практычныя дапаможнікі па стварэнні нацыянальнага касцюма. Вось асноўныя акцэнты аб'яднанага стэнда беларускіх дзяржаўных выдавецтваў. Але калі зірнуць на кніжную выстаўку шырэй, тут можна заўважыць не толькі і не столькі кнігі, колькі жаданне экспанентаў з 31 краіны праз выданні расказаць пра ўласную культуру. Таму часта на стэндах — поруч з кнігамі — мастацкія вырабы, артэфакты, а самі выдаўцы і пісьменнікі — у касцюмах з элементамі традыцыйных строяў свайго народа.**




# Місія кнігі — яднаць




Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## У сталіцы ўрачыста адкрылася XXIV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш




Так, выстаўка ў беларускай сталіцы яшчэ раз паказала: кніга мае здольнасць яднаць літаратуры, культуры, народы не толькі праз прысутнасць у пэўным месцы ў пэўны час, але і праз важныя пагадненні, перамовы, якія становяцца магчымымі дзякуючы форуму. Сёлета ў Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы прымаюць удзел некалькі соцень экспанентаў з 31 краіны. Гэта Беларусь, Азербайджан, Венесуэла, Вялікабрытанія, Германія, Грэцыя, Ізраіль, Іран, Італія, Казахстан, Рэспубліка Карэя, Кітай, Куба, Малдова, Пакістан, Палесціна, Польшча, Расія, Сербія, Сірыя, Славакія, ЗША, Таджыкістан, Туркменістан, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эквадор. Ганаровым госцем выстаўкі стала Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі.

Традыцыйна мінскі кніжны форум прыцягвае ўвагу шырокай грамадскасці, а ва ўрачыстай цырымоніі яго адкрыцця прымаюць удзел прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, пісьменнікі, выдаўцы.

СТАР. 4

■ Справа грамадства

# ДРЭВА ЯК КРЫНІЦА ПРЫБЫТКУ,

## або Навошта патрэбна чорна-зялёная карта?

**Наяўнасць інфармацыі пра эканамічную выгаду ад зялёных зон можа дапамагчы гараджанам пры абмеркаванні планаў забудовы Мінска, упэўнены актывісты грамадскай кампаніі «Гарадскі Ляснічы». Для гэтых мэт яны стварылі так званую чорна-зялёную карту, на якой першым колерам пазначаны прамысловыя зоны, закінутыя прадпрыемствы і пусткі, а другім — паркі і скверы. Для апошніх падлічана тая самая эканамічная выгада, якую яны прыносяць сталіцы і яе жыхарам. Так, напрыклад, зялёны ўчастак памерам 12 гектараў можа захоўваць у гарадскім бюджэце да 240 тысяч рублёў у год. І гэта без уліку грошай, сэканомленых на медыцынскіх паслугах, якія спатрэбяцца жыхарам, што пражываюць у раёнах з дрэннай экалогіяй.**

Чорна-зялёная карта ўжо даступная ў інтэрнэце па адрасе map.urbanforester.by. Праўда, пакуль што на ёй пазначаны звесткі толькі па адным раёне — Ленінскім. Актывісты «Гарадскога Ляснічага» правялі карпатлівую працу па зборы інфармацыі з усіх зялёных зон адміністрацыйнай адзінкі, а для некаторых з іх падлічылі кошт экасістэмных паслуг, якія яны даюць гораду. Гэтак жа падлічаны прыбыткі (ці страты) прадпрыемстваў, што знаходзяцца ў «чорных» зонах.

СТАР. 3

■ Парламенцкі дзённік

# НОВЫЯ КРЫНІЦЫ ФІНАНСАВАННЯ

## Дзяржаўна-прыватнае партнёрства дапаможа развіць інфраструктуру

**Бюджэт заўсёды мае абмежавальныя рамкі, якія не заўсёды задавальняюць патрабаванні пэўных слаёў насельніцтва. Даўно вядома: хочацца заўсёды больш, чым маеш. Але гэта не значыць, што трэба перастаць разлічваць на большае. Дзяржаўна-прыватнае партнёрства дазваляе пашырыць магчымасці фінансавання сацыяльна значных праектаў. Адпаведны закон у нашай краіне пачаў працаваць летам мінулага года, а некалькі месяцаў таму стартаваў першы праект у гэтай сферы. Што можа даць дзяржаве, людзям дзяржаўна-прыватнае партнёрства? Якія перспектывы для яго развіцця ў нашай краіне? Гэтыя пытанні абмеркавалі ў Палаце прадстаўнікоў.**



Коратка пра прадмет размовы. Дзяржаўна-прыватнае партнёрства (скарочана — ДПП) — сукупнасць форм ад сярэдне- і доўгатэрміновага ўзаемадзеяння дзяржавы і бізнесу, накіраваная на вырашэнне грамадска значных задач на ўзаемавыгадных умовах.

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу**, звярнуў увагу: палітычнае рашэнне, заканадаўчая база, арганізацыйныя меры для запуску мадэлі дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Беларусі на сёння прыняты. У канцы 2016 года пачата рэалізацыя першага пілотнага праекта — мадэрнізацыя ўчастка аўтамабільнай дарогі М10.

— Паспяховае здзяйсненне гэтага праекта дазволіць не толькі палепшыць транспартную інфраструктуру краіны, пашырыць яе транзітны патэнцыял, але і стане добрым прыкладам, візітнай карткай Беларусі для патэнцыяльных інвестараў, а таксама міжнародных фінансавых арганізацый, — сказаў спікер. — Важна, каб такое ўзаемадзеянне дзяржавы і бізнесу выйшла на сістэмную аснову, дазваляючы зводзіць грамадскія прыярытэты, а таксама прадпрымальнасць, тэхналогіі, кіраўніцкія навыкі і фінансы, якімі валодае прыватны сектар. Актыўнае развіццё гэтага інструмента будзе служыць прыцягненню інвестыцый, павышэнню сацыяльнай адказнасці бізнесу і зніжэнню нагрузкі на бюджэт краіны.

**Дзмітрый КРУТОЙ, першы намеснік міністра эканомікі**, паведаміў, што нарматыўная база дазваляе працаваць з канкрэтнымі праектамі па ДПП.

— Першы пілотны праект — гэта наша пайднёвая гомельская дарога ад мяжы з Расійскай Федэрацыяй да Кобрына. Ён рэалізуецца з дапамогай кансультантаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця. Па сутнасці, мы апрабуем міжнародныя методыкі. Ужо ўзніклі пэўныя нюансы: замежнікі кажуць пра складанасць нашай заканадаўчай базы, асабліва для практычнага прымянення канкрэтнымі спецыялістамі. Таму ў іншых краінах рэкамендуецца выкарыстоўваць іншыя методыкі фінансавай ацэнкі праекта, падрыхтоўкі конкурсных прапаноў. З улікам вопыту работы па дарозе М10, я спадзяюся, мы спросцім і сваё заканадаўства.

Першы намеснік міністра эканомікі звярнуў увагу, што ў праграме бягучай пяцігодкі ёсць заданне кожнаму губернатару, рэгіёну да 2020 года заключыць не менш за адно пагадненне па праекце дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

**Аляксандр ШВЕЦ, старшыня Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі**, звярнуў увагу на тое, што сёння дзяржава адчувае пэўныя эканамічныя цяжкасці, і працягнуў думку Дмітрыя Крутога:

— У Беларусі свой інвестыцыйны імідж. Праз спецыяльнае заканадаўства, зразумелае, выразна акрэсленае для патэнцыяльных інвестараў, мы можам паскорыць прыцягненне інвестараў у нашу краіну.

**Уладзімір АЎГУСЦІНСКІ, кіраўнік Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь**, падзяліўся вопытам Германіі ў рэалізацыі праектаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

— Тэма важная і для Беларусі, а ў кантэксце глабальных выклікаў, рэгіянальнай сітуацыі, яна важная для любой краіны, якая імкнецца інтэгравацца ў адзіную эканамічную прастору, у глабальную эканоміку, — прызнаў ён. — У Германіі гэты інструмент выкарыстоўваецца таксама адносна нядаўна — на працягу апошніх гадоў. Прычым першыя зачаткі дзяржаўна-прыватнага партнёрства былі яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя — гэта былі некамерцыйныя будаўнічыя кааператывы. Сёння і на федэральным узроўні, і на зямельным, нават на ўзроўні камун у Германіі існуюць прыклады эфектыўнага ўзаемадзеяння дзяржавы і бізнесу. Калі будуць створаны добрыя адпаведныя ўмовы, што дазваляюць узаемадзейнічаць уладзе і бізнесу ў інтарэсах грамадства, могуць рэалізоўвацца сур'ёзнейшыя праекты ў галіне інфраструктуры, транспарту, сацыяльнай сферы. Гэта ўнікальная магчымасць, якая ў Германіі ўжо эфектыўна выкарыстоўваецца. Асабліва гэта актуальна ва ўмовах недастатковасці бюджэтных сродкаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ПАВЯЛІЧАНЫ НОРМЫ РАСХОДАЎ НА ХАРЧАВАННЕ

**Гэта замацавана пастановай Савета Міністраў ад 3 лютага 2017 года №95, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Дакумент уносіць змяненні ў пастанову Саўміна ад 27 красавіка 2013 года №317 «Аб нормах харчавання і грашовых нормах расходаў на харчаванне навучэнцаў, а таксама ўдзельнікаў адукацыйных мерапрыемстваў з ліку асоб, якія навучаюцца ва ўстановах адукацыі».

У прыватнасці, павялічаны грашовыя нормы расходаў на харчаванне на 5 працэнтаў ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а таксама ў аздараўленчых лагерах і на харчаванне ўдзельнікаў адукацыйных мерапрыемстваў з ліку асоб, якія навучаюцца ва ўстановах адукацыі.

Так, кошт харчавання ва ўстановах дашкольнай адукацыі ў залежнасці ад узросту дзіцяці і яго знаходжання ў гэтай установе складзе ў сярэднім ад Br41,14 да Br77,44 у месяц, у агульнаадукацыйных школах — у залежнасці ад узросту навучэнца і часу яго знаходжання ва ўстанове — ад Br1,5 да Br5,14.

■ Грошы

# Стаўка рэфінансавання да канца 2020 года складзе 7—9%,

## А ТЭМПЫ РОСТУ ВУП ВЫРАСТУЦЬ

**Пра гэта заявіў міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ на сумесным пасяджэнні Мінэканомікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Міністр адзначыў, што сустрэча ініцыявана з мэтай абмеркавання рэалізацыі эканамічным блокам і дэпутацкім корпусам краіны рашэнняў, прынятых на пятым Усебеларускім народным сходзе — асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады.**

«У нас няма па ёй рознагалоссяў. Усе крокі выверány і скаардынаваны. Таму бачу сустрэчу як працяг нашага з вамі дыялогу», — дадаў міністр. Паводле яго слоў, галоўная мэта на пяць гадоў — павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця. Для яе дасягнення ў праграме вызначаны актуальныя прыярытэты: інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя, моладзь. Выпрацаваны новыя інструменты і механізмы рэалізацыі эканамічнай палітыкі.

«У першую чаргу гаворка ідзе аб павышэнні эфектыўнасці кіравання эканомікай: аптымізацыя колькасці і функцый дзяржаўнага апарату, стварэнне «кампактнага» ўрада, удасканаленне адносін уласнасці», — растлумачыў міністр.

Другім кірункам стане разняволенне дзелавой ініцыятывы, удасканаленне кантрольнай дзейнасці і стварэнне рэальных умоў па паляпшэнні вядзення бізнесу. «Прадугледжаныя меры падтрымкі дадуць магчымасць прыцягнуць інвестыцыі ў развіццё тэрыторый, скараціць міжрэгіянальныя адрозненні», — лічыць Уладзімір Зіноўскі.

Трэці кірунак — зніжэнне ставак па крэдытах банкаў ва ўвязцы са зніжэннем інфляцыі ў эканоміцы да канца 2020 года да 5%. «Гэта акажа стымулюючы ўплыў не толькі на інвестыцыйную актыўнасць, але і на фінансавы стан арганізацый. Стаўка рэфінансавання да 2020 года складзе 7—9% гадавых, стаўка па новых крэдытах банкаў у нацыянальнай валюце складзе 9—11% гадавых», — расказаў міністр.

Чацвёртым кірункам Уладзімір Зіноўскі назваў стварэнне паўнавартаснага фінансавага рынку з новымі магчымасцямі для фінансавання — карпаратыўныя аблігацыі, праектнае крэдытаванне, размяшчэнне акцый на міжнародных фондавых біржах пры дапамозе замежных дэпазітарных распісак.

«Тэмп росту ВУП за пяцігоддзе прагназуецца ў дыяпазоне 112,1—115%. Гэта больш чым у 2 разы вышэй, чым у мінулай пяцігодцы. — адзначыў Уладзімір Зіноўскі. — Паказчык знешняй збалансаванасці — сальда знешняга гандлю, пачынаючы з 2017 года, прагназуецца ўстойліва станоўчым».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Самыя высокія пенсіі — у Мінску

**Сярэдні памер пенсій у Мінску ў студзені аказаўся вышэй на 6,1%, чым у сярэднім па краіне, і склаў 315 рублёў.**

Дарэчы, Мінск з'яўляецца адзіным рэгіёнам са значным ростам колькасці пенсіянераў. Сёння ў органах сацыяльнай абароны сталіцы на ўліку знаходзіцца больш за 484 тысячы атрымальнікаў пенсій, з іх амаль 40% працягваюць працаваць. За мінулы год колькасць пенсіянераў у горадзе павялічылася больш чым на 10 тысяч чалавек. Для параўнання: у Віцебскай вобласці за мінулы год атрымальнікаў пенсій стала больш на 1,4 тысячы, у Мінскай вобласці — больш на 3,9 тысячы.

Па словах **старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанны РАМАНОВІЧ**, пенсійная сістэма Мінска, нягледзячы на ўзрослую нагрузку, працуе стабільна. Забяспечваецца своечасовае фінансаванне, пераразлікі і выплата пенсій.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

## Суботні інтэрактыў працягваецца

**Чыноўнікі ўсіх рангаў 11 лютага зноў будуць на прамой сувязі з грамадзянамі краіны. Тры гадзіны на тэлефоннай лініі, як правіла, дазваляюць уладам даведацца пра новыя праблемы ў рэгіёнах, дапамагчы іх вырашыць і адказаць на самыя актуальныя пытанні беларусаў.**



**З 9.00 да 12.00 на званкі ў гэтую суботу будуць адказваць:**

Брэсцкі аблвыканкам:
намеснік старшыні Сяркоў Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам:
першы намеснік старшыні Грабнёў Генадзь Івановіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам:
старшыня абласнога Савета дэпутатаў Барысенка Алег Леанідавіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам:
першы намеснік старшыні Жук Іван Алейзавіч (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам:
намеснік старшыні Янкоў Дзмітрый Васілевіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам:
старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ліпніцкі Іван Эдуардавіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам:
намеснік старшыні Лапцеў Віктар Сяргеевіч (80172224444).

■ Дэкрэт №3

# Гэты збор трэба аплаціць да трэцяй дэкады лютага

**У прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) нагадалі, што тэрмін аплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год заканчваецца сёлета 20 лютага. Таму чалавек, які атрымаў адпаведнае паведамленне, мае права падаць у падатковы орган дакументы і (або) тлумачэнні, якія сведчаць аб адсутнасці ў яго абавязкаў па аплаце збору.**

Спецыялісты МПЗ паведамляюць, што цяпер праінфармаваць падатковы орган пра сваё права на вызваленне ад аплаты збору можна шляхам накіравання ў інспекцыю па пошце ці ў электронным варыянце адпаведных матэрыялаў праз сэрвіс «Электронны зварот», які размешчаны на сайце міністэрства *http://www.nalog.gov.by/ru/obrascheniе_grazdan_ru/*

Інфармацыя аб тых, хто вызваляецца ад аплаты збору, размешчана на сайце МПЗ у раздзеле «Збор на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў». Спасылка *http://www.nalog.gov.by/ru/declarirovanie_grajdan_ru/view/cborna-finansirovanie-gosudarstvennyx-rasxodov-21943/*

Эксперты падатковай галіны асобна звяртаюць увагу на тое, што сёння такія падаткаплацельшчыкі маюць права звярнуцца ў мясцовы Савет дэпутатаў або ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган (калі Савет дэпутатаў дэлегаваў яму права вызваляць ад аплаты збору) з заявай на вызваленне ад аплаты збору за 2015 год у сувязі са знаходжаннем у цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Паводле інфармацыі па стане на 7 лютага, падатковыя органы накіравалі фізасобам каля 470 тысяч паведамленняў на аплату такога збору. Сёння з іх 44,5 тысячы чалавек збор аплацілі, а ў бюджэт паступіла больш як 13,4 млн рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Асцярожна, дзеці!

# НАСЦЕННАЯ ГУЛЬНЯ, 3D-МАКЕТ І ТВОРЧЫЯ РАБОТЫ

## Як школьнікаў вучаць правілам паводзін на дарозе

**Некалькі дзён таму інтэрнэт ускалыхнула навіна, што сярод дзяцей і падлеткаў стала папулярнай гульня «Бяжы або памры», сутнасць якой у тым, каб максімальна блізка прабегчы перад машынай, якая рухаецца. Нібыта забаўка ўжо захапіла Расію, Украіну і Казахстан і вось дайшла да Беларусі. На самай справе гэтая інфармацыя аказалася лжывай, а вось паніка сярод бацькоў сапраўднай. І нездарма, бо дарога — адна з найбольш яўных «пагроз», з якой дзецям штодзённа прыходзіцца сутыкацца з самага ранняга ўзросту.**

Менавіта таму бяспецы дарожнага руху надаецца асаблівая ўвага ў рабоце са школьнікамі і нават дашкольнікамі як педагогамі, так і супрацоўнікамі ДАІ. Прыкладам іх узаемадзеяння паслужыла адкрыццё ў Фрунзенскім раёне сталіцы інтэрактыўнай пляцоўкі «Горад бяспечнага дзяцінства» на базе гімназіі №37. Пляцоўка ўключае ў сябе магнітную насценную гульню па правілах дарожнага руху, а таксама вялізны 3D-макет. Ён у зменшаным памеры ўяўляе сабой рэальную вулічна-дарожную сетку, якая прылягае да тэрыторыі гімназіі. У гэтым заключаецца яго галоўная каштоўнасць: дзеці разам з настаўнікам разбіраюць найбольш складаныя ўчасткі дарогі, а таксама прадумваюць аптымальны маршрут да школы для кожнага. Для нагляднасці навучэнцам прапануецца выкарыстоўваць мадэлі будынкаў, дарожных знакаў, святлафораў.

Па статыстыцы, часцей за ўсё сярод непаўналетніх удзельнікамі дарожна-транспартных здарэнняў становяцца дзеці ва ўзросце ад 7 да 12 гадоў, таму макет разлічаны на гэты ўзрост. У аснове распрацоўкі — псіхалагічны аспект: сур'ёзныя веды падаюцца ў гульнявой форме. Напрыклад, аб дарожных знаках расказваецца ў вершах, прычым у працэсе задзейнічаны казачныя лега-паліцэйскія.

Яшчэ адзін эфектыўны спосаб вывучэння правілаў дарожнага руху — творчасць. Нядаўна завяршыўся гарадскі этап маштабнага конкурсу «Выконваем законы дарог», які праводзіцца ў рамках праекта «Дарожная бяспека» для дзяцей і моладзі 6—18 гадоў Дзяржаўтаінспекцыяй г. Мінска і цэнтрам «Бяспечнае дзяцінства» мінскага Палаца дзяцей і моладзі.

Больш за два тыдні праходзіла выстава, падчас якой журы ўважліва вывучала і ацэньвала прадстаўленыя работы, якіх было больш за 150 у 15 розных намінацыях: «Лепка», «Плакат», «Мяккая цацка» і іншыя. «Прыз глядацкіх сімпатый» дастаўся Аль-Хайкі Айману, вучню 2 класа гімназіі №75 за работу пад назвай, якая адсылае нас да знакамітай фразы з «Ералаша»: «Бацькі! Навушнікі зняць ці не хочаце?» Конкурс праводзіцца ўжо 13-ы год, у агульным заліку перамогу зноў, ужо дзясяты раз, атрымала каманда вучняў і педагогаў з Кастрычніцкага раёна сталіцы. Работы пераможцаў прадставяць г. Мінск на рэспубліканскім этапе конкурсу, які адбудзецца ў чэрвені на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.



**«Выдатнікі» інтэрактыўнай пляцоўкі «Горад бяспечнага дзяцінства» атрымліваюць спецыяльна прыдуманы нагрудны знак «Лепшы знаўца ПДР».**

Дзякуючы актыўнай прафілактычнай рабоце, на шчасце, за апошнія некалькі гадоў аварыйнасць на дарогах сталіцы з удзелам дзяцей значна знізілася. Аднак на дасягнутым ніхто спыняцца не збіраецца: падобныя вучэбна-гульнявыя комплексы ў перспектыве павінны з'явіцца ў многіх навучальных установах, а сама тэма — увесь час заставацца на слыху.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviada.by*

# НА ПІКУ СЕЗОНА

## Сёння стартуе чэмпіянат свету па біятлоне

**Да галоўных гонак сёлетняга спаборніцкага года нашы жаночая і мужчынская каманды рыхтаваліся ў розных гарадах і нават краінах. Жаночая дружына пад кіраўніцтвам Фёдара Свабоды праходзіла зборы ў нямецкім Рупольдынгу, за выключэннем Дар'і Домрачавай. Яна разам з мужам Уле-Эйнарам Б'ёрндаленам рыхтавалася да чэмпіянату свету ў італьянскім Антхольцы. Мужчынская беларуская каманда пад кіраўніцтвам Аляксандра Сымана прайшла падрыхтоўку ў аўстрыйскім Рамзау. Вынікі старанняў нашых трэнераў і спартсменаў убачым ужо днямі.**



Сёлетні чэмпіянат свету пройдзе ў аўстрыйскім Хохфільцэне з 9 па 19 лютага, яго прымае абноўлены стадыён, які змяшчае больш за 10 тысяч балельшчыкаў. Арганізатары паведамляюць, што на трасах укладзена ад 30 да 50 см снегу, таму ніякіх праблем з-за надвор'я паўстаць не павінна. Чакаецца, што спаборніцтвы наведаюць звыш 100 тысяч балельшчыкаў.

За некалькі дзён да старту трэнерскі штаб беларускай зборнай аб'явіў склад каманд. У мужчынскую дружыну ўвайшлі Уладзімір Чапелін, Дзмітрый Абашаў, Сяргей Бачарнікаў, Раман Ялётнаў, Максім Варабей. У жаночую — Дар'я Домрачава, Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко, Дар'я Юркевіч і Надзея Пісарава.

Спаборніцкая праграма адкрыецца сёння змешанай эстафетай. Плануецца, што ад нашай зборнай выступіць квартэт, у які ўвойдуць: Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко, Уладзімір Чапелін і Сяргей Бачарнікаў. Лідар зборнай Дар'я Домрачава пачне сваё выступленне ў Хохфільцэне са спрынтарскай гонкі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

### Расклад гонак чэмпіянату свету:

**9 лютага (16.45) — змешаная эстафета**
**10 лютага (16.45) — спрынт, жанчыны**
**11 лютага (16.45) — спрынт, мужчыны**
**12 лютага (12.30) — гонка праследу, жанчыны**
**12 лютага (16.45) — гонка праследу, мужчыны**
**15 лютага (16.30) — індывідуальная гонка, жанчыны**
**16 лютага (16.30) — індывідуальная гонка, мужчыны**
**17 лютага (16.45) — эстафета, жанчыны**
**18 лютага (16.45) — эстафета, мужчыны**
**19 лютага (13.30) — мас-старт, жанчыны**
**19 лютага (16.45) — мас-старт, мужчыны.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### Беларус прадаў чужы трактар

**На «МТЗ-80» 42-гадовы мужчына працаваў у прыватнай фірме: расчышчаў дарогі, адцягваў бярвенне. Але ж жыхар вёскі Бяляеўка, што ў Чачэрскім раёне, вырашыў, што яго працу аплачваюць недастойна, і надумаў зарабіць іншым спосабам.**

За бутэлькай спіртнога аднавяскоўец прапанаваў яму паказаць дарогу да самай блізкай расійскай вёскі — усяго за 25 кіламетраў. На наступны дзень грамадзянін пагнаў трактар на замежную скупку металу. Між тым, скупшчык, грамадзянін Беларусі, вельмі здзівіўся, але грошы заплаціў за тэхніку, якая знаходзілася ў прыдатным стане. Пасля чаго адразу ж патэлефанаваў у Чачэрскі РАУС і паведаміў пра абставіны куплі і прапанаваў перагнаць трактар назад.

Як расказаў афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь Прыстромаў, беларускія праваахоўнікі аператыўна звязаліся з расійскімі калегамі, якія кантралявалі сітуацыю і праводзілі працэс вяртання. А прадавец чужой тэхнікі абмываў «удалую» аперацыю на радзіме. Тым часам дырэктар лесанарыхтоўчай фірмы прыехаў да трактарыста клікаць яго на працу і не пабачыў на падворку свой «Беларус». Калі ўладар тэхнікі звярнуўся ў міліцыю, трактар быў ужо на радзіме.

Цяпер распачата крымінальная справа, а прадавец чужога трактара затрыманы. За прысваенне маёмасці яму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да чатырох гадоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

### Бацька напаў на супрацоўніка ДАІ

**У Ветцы затрымалі паляўнічых-нелегалаў, якія даўно былі на падазрэнні ў праваахоўнікаў.**

Каб злавіць арганізаваную групу з доказамі злачынства, дзяржінспектары Гомельскай міжрайінспекцыі працавалі разам з калегамі з Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй і супрацоўнікамі ДАІ. Парушальнікаў у розных кропках чакалі тры экіпажы. Адзін з іх а 4-й гадзіне раніцы спыніў машыну падазраваных на ўездзе ў горад.

Пры аглядзе аўтамабіля, у якім ехалі трое гамяльчан, дзяржаўтаінспектар выявіў расчахлёную стрэльбу і торбу з мясам. Калі парушальнікі ўсвядомілі, што адбылося, яны перайшлі да агрэсіўных дзеянняў, расказалі ў Дзяржінспекцыі. Адзін напаў на супрацоўніка ДАІ, яго 19-гадовы сын схапіў зброю і паспрабаваў уцячы. Зламыснікаў затрымалі экіпажы, што прыйшлі на дапамогу.

У лясным масіве каля дарогі Ветка—Свяцілавічы, адкуль прыехалі парушальнікі, дзяржінспектары знайшлі месца здабычы казулі — яе мяса, хутчэй за ўсё, і перавозілі нелегалы. У доме затрыманых было знойдзена яшчэ каля 50 кілаграмаў мяса, як мяркуецца, лася, а таксама фрагменты шкуры і рогі гэтай жывёлы. Акрамя таго, там захоўваліся тры стрэльбы — дзве зарэгістраваныя на бацьку, прыналежнасць трэцяй высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### Канспірацыя не дапамагла

**Наркалабараторыю, арганізаваную ў склепе прыватнага дома ў Гомелі, рассакрэцілі міліцыянеры.**

У строгай канспірацыі двое гамяльчан арганізавалі вытворчасць амфетаміну. Уначы зелле варылі, днём прадавалі. Як расказаў афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь Прыстромаў, наркадзілеры паводзілі сябе вельмі асцярожна:

— Пасля кожнага варэння лабараторыю згортвалі: прылады чысцілі, дзялілі на часткі і хавалі. Падчас рэалізацыі працавалі толькі з праверанымі заказчыкамі.

Арганізатарам быў 38-гадовы гамяльчанін, які атрымаў сакрэтны рэцэпт у спадчыну ад стрыечнага брата, які адбывае пакаранне за выраб і распаўсюджванне наркотыкаў. 34-гадовы прыяцель стаў памочнікам. Машыну аднаго са злодзеяў затрымалі ноччу на трасе Гомель—Чарнігаў супрацоўнікі ДАІ. У аўтамабілі быў знойдзены палімерны скрутак з амаль 10 грамамі рэчыва, якое экспертыза вызначыла як амфетамін. Другога грамадзяніна затрымалі ў цэнтры Гомеля — таксама з наркотыкам.

У склепе па месцы жыхарства знайшлі каністры з прэкурсорамі, шмат бутэлек з воцатнай кіслатой, керамічную лямпу, шкляныя колбы, электраплітку, выцяжку, маскі для бяспечнай работы з хімічнымі элементамі... Другая частка лабараторных прылад была знойдзена за сцяной са складзеная белай цэглы. У адным з пакояў дома аператыўнікі знайшлі і 23 грамы гатовага нарказелля. Цяпер у адносінах да мужчын распачата крымінальная справа. Праводзіцца комплекс аператыўна-следчых і экспертных мерапрыемстваў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ДРЭВА ЯК КРЫНІЦА ПРЫБЫТКУ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Галоўная мэта нашай работы — выкарыстанне гэтых звестак падчас грамадскага абмеркавання праектаў па забудове горада, — гаворыць **удзельнік кампаніі «Гарадскі Ляснічы» Дзмітрый ГЕРЫЛОВІЧ.** — На маю думку, мы павінны падтрымліваць тэндэнцыю захавання зялёных насаджэнняў. Часта даводзіцца чуць, што Мінск — зялёны горад, але статыстыка гэтага не пацвярджае. Калі б не ўключаныя нядаўна ў гарадскую рысу новыя тэрыторыі (напрыклад, у раёне Заслаўскага вадасховішча), то сталіца нават на паперы не заставалася б «зялёнай».

Якім чынам падлічваецца эканамічная выгада ад захавання зялёных зон? Актывісты кампаніі карысталіся тэхнічным кодэксам усталяванай практыкі, распрацаваным вучонымі Нацыянальнай акадэміі навук. Як расказала **навуковы супрацоўнік сектара маніторынгу расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Вольга ЯФІМАВА**, чалавек у сярэднім спажывае каля 270 кілаграмаў чыстага кіслароду за год. Столькі ж гэтага газу выдзяляе адна дарослая таполя ці дуб. Яшчэ адна ключавая функцыя дрэў — асаджэнне пылу: яны затрымліваюць да 70 працэнтаў гэтага забруджвальніка.

Пры гэтым не браўся ў разлік непрамы эканамічны эфект зялёных зон. Справа ў тым, што паркі і скверы з'яўляюцца натуральнымі рэкрэатыўнымі зонамі, і жыхарам не трэба траціцца на паездкі за горад, каб паправіць здароўе ці проста адпачыць. Таму замест ушчыльнення гарадской забудовы за кошт дрэў варта шукаць варыянты на ўжо занятых прадпрыемствамі тэрыторыях, якія выкарыстоўваюцца нерацыянальна.

Плануецца, што ўжо ў 2019 годзе чорна-зялёная карта будзе ахопліваць усю сталіцу. А ў перспектыве — і ўсю краіну. Аднак для гэтага актывістам патрэбна дапамога валанцёраў па ўліку дрэў і прамысловых зон сталіцы. Ужо сёлета павінна з'явіцца вэб-праграма, пры дапамозе якой кожны ахвотны зможа нанесці на карту зялёныя насаджэнні ў сваім раёне. Дадатковую інфармацыю па далучэнні да картаграфавання можна знайсці на сайце «Гарадскога Ляснічага».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# Місія кнігі — яднаць






*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ**, адкрываючы форум, зачытаў прывітальныя слова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Ён таксама дадаў: «Для некага кніга — гэта проста падручнік, для некага — добры прадмет інтэр'ера. Але самае галоўнае, што ва ўсе часы і ўсе стагоддзі кніга — самы вялікі памочнік у жыцці».



«З дапамогай кнігі мы будзем казаць, што слова вызначае, што слова — гэта веды і сіла, наш духоўны запавет нашчадкам. Спадзяюся, што пасланнікі ў сферы кнігавыдання і гуманітарнага супрацоўніцтва, якія завіталі ў Мінск больш як з трох дзясяткаў краін, зробяць важкі ўнёсак у развіццё сяброўскіх, добрасуседскіх адносін і ўмацаванне самага вялікага здабытку — міру», — зазначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. Міністр таксама расказала, што менавіта падчас выстаўкі распачынаецца шырокае святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое пройдзе не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

Вялікую ўвагу наведвальнікаў падчас адкрыцця кніжнага кірмашу прыцягваў друкарскі станок з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава, які ўзнаўляе тэхналогію друку XVI стагоддзя, госці выстаўкі імкнуліся пакаштаваць салодкія прысмакі з Усходу, але безумоўным лідарам масавага прызнання сталі музыкі з шатландскімі валынкамі. Так, Вялікабрытанія, краіна — Ганаровы госць форуму, не толькі прадставіла яркі выставачны стэнд, але і падрыхтавала вялікую праграму. «Быць Ганаровым госцем Мінскай кніжнай выстаўкі-кірмашу — вельмі значна для нашай краіны, — падкрэсліла **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі спадарыня Фіёна ГІБ**. — На нашым стэндзе вас чакаюць сустрэчы, майстар-класы, прэзентацыі, мы запланавалі круглыя сталы. Спадзяюся, што ў нашай праграме кожны знойдзе нешта цікавае і карыснае для сябе».

І сапраўды, міжнародны форум — выдатная нагода здзейсніць падарожжа ў свет кнігі, завесці новыя знаёмствы, паўдзельнічаць у конкурсах, атрымаць аўтограф любімага пісьменніка. А яшчэ ён дае магчымасць і самім літаратарам, выдаўцам пагутарыць пра самыя актуальныя пытанні галіны. Ужо сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праходзіць пленарнае пасяджэнне Міжнароднага сімпозіума «Пісьменнік і час: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання як частка сусветнай кніжнай гісторыі». У Мінск завіталі і маладыя літаратары, каб прыняць удзел у семінары, пачуць парады старэйшых калег і пазнаёміцца з сваімі равеснікамі з творчымі напрацоўкамі.

Нагадаем, што Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш праходзіць да 12 лютага ў Адміністрацыйным комплексе па адрасе: праспект Пераможцаў, 14. Уваход на кніжную выстаўку свабодны.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*





Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЛІТАРАТУРА АД СЭРЦА ДА СЭРЦА

## Чытач можа адкрыць для сябе творчасць паэтэсы Агулбіке АРАЗГЕЛЬДЫЕВАЙ

**XXIV Міжнародная кніжная выстаўка збірае ў Мінску літаратараў з многіх краін. Добрай традыцыяй стала друкаваць творы замежных пісьменнікаў і паэтаў у беларускамоўным перакладзе. Сёлета чытачы змогуць адкрыць для сябе творчасць туркменскай паэтэсы Агулбіке Аразгельдыевай. Яе пачуццёвыя кранальныя вершы — не толькі літаратурная, але і гістарычная спадчына.**

У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ёсць экспанат, які для прадстаўніка Туркменістана паэта Агагельды Алланазарава мае асаблівую каштоўнасць. Гэта дыван, што туркменскія майстры выткалі ў падарунак генералу Канстанціну Ракасоўскаму. Калі прыглядзецца, то, акрамя партрэта самога будучага маршала Савецкага Саюза, ва ўзоры відаць абрысы танкаў, самалётаў, іншай ваеннай тэхнікі. Аднак для замежных гасцей гэты экспанат не толькі сімвал надзеі на перамогу савецкага войска, але яшчэ і сведка незвычайнай гісторыі.

— У часы вайны народы Савецкага Саюза падтрымлівалі адзін аднаго, Туркменія адсылала дапамогу для падтрымкі салдат на фронце. Разам з эшалонам з усім неабходным у дарогу адправіліся і тыя, хто дапамагаў збіраць падарункі савецкім салдатам. Была сярод іх і Агулбіке, — расказвае **туркменскі паэт Агагельды АЛАНАЗАРАЎ**. — Гасцей сустракаў генерал Канстанцін Ракасоўскі. Калі былі сказаны словы падзякі, прадстаўнік дэлегацыі сказаў, што разам з імі прыехала жанчына, муж якой ваюе з ворагам у радах Чырвонай Арміі. Ракасоўскі зацікавіўся, хто гэта. Тады Агулбіке расціснула далонь і паказала ліст, што прыйшоў з фронту. Генерал запатрабаваў, каб муж і жонка змаглі пагаварыць адно з адным хоць бы па тэлефоне. «Вяртайся дамоў. Я сам прыеду, калі скончыцца вайна», — пачула тады жанчына. А праз тры месяцы атрымала пахвальную на свайго мужа.



Фота Надзеі БУЖАН.

Вершы паэтэсы Агулбіке Аразгельдыевай пераклаў на беларускую мову **паэт Мікола МЯТЛІЦКІ**.

— Калі лёс народа, які паказаў паэт, сугучны лёсу твайго народа, тады ўзнікае цікавасць да творчасці. Так адбылося і з вершамі Агулбіке. Яны кранулі мяне тым, што вельмі чалавечныя, спалучаюць адначасова і слёзы, і ўсмешку, і пакуты, і спадзяванне. Жанчына верыла, што яе муж, з якім яна была разам усяго два месяцы, вернецца дамоў. Знаёмы мне быў і боль, калі паэтэса атрымала вестку пра смерць блізкага чалавека. У той час многія плакалі над пахавальнымі, так было і з маёй бабуляй. Вось такія болевыя кропкі яднаюць і ўплываюць на выбар перакладчыка. Думаю, немагчыма абысці творчасць Агулбіке, бо яе словы многім нашым суайчыннікам таксама лягуць на сэрца.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

■ Не прапусціце!

# КАР'ЕРНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Аказаць садзейнічанне ў працаўладкаванні студэнтаў і пошуку першага працоўнага месца заклікаць адкрыты Рэспубліканскі кар'ерны форум, які пройдзе ў Мінску 15 лютага. Яго арганізатарамі выступілі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Міністэрства адукацыі.**

За час работы форуму ў студэнтаў з'явіцца цэлы шэраг цікавых прапаноў і рэальных магчымасцяў. Будучыя спецыялісты пазнаёмяцца з рэаліямі сучаснага рынку працы, змогуць знайсці добрую вакансію і месца для праходжання практыкі або стажыроўкі, пашыраць кола сваіх прафесійных кантактаў, а таксама атрымаюць практычны вопыт ад прапанаваных рашэнняў-кейсаў кампаній, што ўдзельнічаюць у форуме.

Праграма ўключае шырокі спектр тэматычных акцый. У рамках форуму пройдуць майстар-класы, выступленні спікераў, а таксама троххвілінныя гутаркі з работадаўцамі. У ролі спікераў выступяць прадстаўнікі раздзела «Праца» на партале TUT.BY, «Альфа-Банка» і фонду «Сколкава». Іх выступленні і прэзентацыі дапамогуць знайсці адказы на актуальныя пытанні, якія датычацца асабістага росту маладых спецыялістаў, попыту на прадстаўнікоў розных спецыяльнасцяў на сучасным рынку працы, складання рэзюмэ і іншыя.

А, напрыклад, слухачоў лабараторыі дызайн-мыслення навучаць структураванаму падыходу да вырашэння праблем, якія не маюць, на першы погляд, відавочных рашэнняў. Такая метадалогія дызайн-мыслення аформілася нядаўна, у 2007 годзе, у Школе дызайну Стэнфардскага ўніверсітэта (ЗША), але ўжо шырока выкарыстоўваецца ў такіх канкурэнтаздольных кампаніях, як Google, Apple, SAP, Mercedes, Electronic Arts, VISA і іншых.

У рамках форуму пройдзе таксама панэльная дыскусія на тэму «Скарачэнне адлегласці паміж акадэмічнай адукацыяй і патрэбамі бізнесу». Удзел у ёй возьмуць спецыялісты Міністэрства адукацыі і прадстаўнікі бізнес-супольнасцяў.

Пляцоўкай для правядзення форуму стане мінскі гатэль «Пекін» (вул. Чырвонаармейская, 36).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*



## ДЗЯКУЙ ЗА ТВОЙ ЧАС

Таня, калі мы вучыліся ва ўніверсітэце, марыла зарабіць шмат грошай і купіць сваёй маме джынсавы касцюм і ружовы кадылак. Я таксама, калі пачала працаваць, старалася чым-небудзь парадаваць бацькоў. То новы чайнік прывязу, то цёплыя калготкі... Бацькі прымалі гэтыя сціплыя падарункі, але чаканай радасці я на іх твары не бачыла. А праз некалькі месяцаў знаходзіла тыя калготкі ў сваім заплечніку. Ды і чайнік так і стаіць не кранbriefly.

Мінулы раз я ехала дадому з цвёрдай мэтай: нарэшце навучыцца шыць Пакуль тата тлумачыў, як устаўляць катушкі з ніткамі ў швейную машынку ды мяняць звычайнае шво на зігзагападобнае, мы з ім, здаецца, сталі бліжэйшыя. За некалькі гадзін я даведалася шмат новага пра роднага чалавека. У прыватнасці, што шыць тату ніхто не вучыў. «Проста настаўніца сказала прынесці пакунак для навагодняга падарунка. У той час цэлафанавыя былі ў дэфіцыце. Таму я прыйшоў дадому, выдраў са сшытка дзве старонкі і сшыў іх, як атрымалася, на мамінай машынцы».

Спачатку тата злаваўся, што ў мяне не атрымлівалася рытмічна націскаць нагой — і нітка зрывалася. Але калі праз некалькі гадзін спроб і памылак ён убачыў цэлую кучу пакункаў для захоўвання фасолі (я іх пашыла са старых навалачак), рэзюмаваў: «Ну, вось цяпер і замуж можна аддаваць» (гэта яго каронны выраз — найвышэйшая ступень пахвалы). А потым з гонарам расказваў па скайпе сваякам пра мае поспехі.

Памятаю, як улетку патэлефанаваў Сцёпа: «Можаш запытацца ў сваёй маці рэцэпт тых салодзенькіх агурочкаў, якімі ты мяне частавала». Калі перадала матулі просьбу сябра, тая, здаецца, ажно памаладзела.

Закруткі мама робіць, колькі я сябе памятаю. Слоікаў пад 200, самых розных памераў. Сярод іх не толькі ўлюбёныя ўсімі маімі сябрамі агурочкі, але і салянка з капустай і грыбамі, кабачковая ікра, кампоты, варэнне... У дзяцінстве я бачыла, як мама робіць тыя закруткі, але самой вучыцца не хацелася. Маўляў, мне гэта не спатрэбіцца, цяпер усё ў краме можна набыць.

А нядаўна жаданне навучыцца ўзнікла. Пасля таго як на працы наткнулася на паўлітровы слоік з крамным малінавым варэннем. Яго пакінула, сыходзячы ў дэкрэт, каляжанка. Есці тое варэнне пасля мамінага я не змагла. Мама ж, калі пачула, што я збіраюся ўзяць у яе майстар-клас па закрутках, здаецца, зноў памаладзела.

Андрэй яшчэ ў студэнцкія гады з'ехаў за акіян. На радзіме бываў рэдка. Вучоба, кар'ера... Ды што там казаць, на жонку і сына не заўсёды хапала часу. Неяк увечары патэлефанавала маці і паведаміла яму, што памёр сусед. Па шчырасці, Андрэй даўно не ўспамінаў пра дзеда Грышу. Але са слоў маці аказалася, што стары часта пытаўся пра Андрэйку. Успамінаў тыя дні, якія хлопчык праводзіў з ім. (Андрэй рана застаўся без бацькі. Таму менавіта дзед Грыша навучыў хлопца майстэрству цяслярскай справы, якое лягло потым у аснову яго бізнесу).

Праз некалькі дзён Андрэй атрымаў пасылку. Там была маленькая скрыначка. Тая самая, што ляжала пад замком у верхняй шуфлядзе пісьмовага стала суседа. У дзяцінстве Андрэй тысячу разоў пытаўся ў дзеда Грышы, што знаходзіцца ў гэтай скрыначцы. На што атрымліваў адказ: «Там тое, што я цаню больш за ўсё ў сваім жыцці». У канверце ляжаў ключык і запіска: «Пасля маёй смерці, калі ласка, перашліце гэтую скрыначку Андрэю Леціну (побач быў яго амерыканскі адрас)». Ледзь стрымліваючы слёзы, Андрэй беражліва адчыніў скрыначку. Унутры ляжаў залаты кішэнны гадзіннік, а на яго вечку было выгравіравана «Дзякуй за твой час, Андрэйка! Р. Б.» Андрэй выклікаў сакратарку і папрасіў адмяніць усе сустрэчы на бліжэйшы тыдзень. На здзіўленае «навошта?» адказаў, што яму трэба час, каб правесці яго з сям'ёй.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*


# Сямейная газета

Выпуск № 3 (70)


■ Гэта па-нашаму!

# ЭФЕКТ МАТЫЛЬКА,
## або Мужчыны таксама хочуць быць моднымі





**А вы ўжо прыдумалі, як будзеце віншаваць сваіх каханых і абаронцаў 14 і 23 лютага? У пошуках арыгінальнага падарунка я на днях завітала ў краму хэндмэйд-вырабаў. Прадавец убачыла мой азадачаны погляд і параіла звярнуць увагу на стойку з рознакаляровымі гальштукамі-«матылькамі». «Не ведаю, можа, гэта піск моды такі, але толькі за апошнія дні ў мяне з дзясятак купілі. Прычым бяруць не толькі для салідных мужчын, але і для маладых хлопцаў. Я таксама не ўтрымалася, сваму тату адзін пакінула, ён у мяне гарманіст, часта на сцэне выступае».**
**Што трэба ўлічваць пры выбары гальштука-матылька? З гэтым пытаннем я звярнулася да дызайнеркі з Оршы Веранікі Машарскай, якая вырабляе мужчынскія аксесуары.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Рабіць дабро

# МАЛЮНАК НА ЦЕЛЕ

## Мінчанка робіць бясплатныя татуіроўкі жанчынам пасля складаных анкалагічных аперацый

**20 гадоў таму Ала Рамазанава ўпершыню ўзяла ў рукі тату-машынку. Пасля было шмат эксперыментаў і пошукаў «свайго» напрамку ў прафесіі. Цяпер жа татуіроўшчыца дапамагае жанчынам, якія перамаглі рак грудзей, зноў адчуць сябе шчаслівымі — працягваць жыццё без бачных рубцоў, што засталіся пасля аперацыі як успамін пра самае цяжкае выпрабаванне.**



Спачатку практыкі было не так шмат. Але са з'яўленнем інтэрнэту зваротаў жанчын стала значна больш.

Фота Надзеі БУЖАН.

### ТАТУ ПАВІННА БЫЦЬ ПАЗІТЫЎНЫМ

— Усё пачыналася як хобі, — расказвае Ала. — У мяне былі сябры-нефармалы, якія ведалі, што я ўмею маляваць, і часам прасілі зрабіць ім тату. Потым я прыехала ў Мінск, паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў і ўладкавалася працаваць у адзін тату-салон. З таго часу гэта і стала маёй прафесіяй.

Паступова Ала пачала адыходзіць ад брутальнай мужчынскай татуіроўкі. Як прызнаецца сама майстар, яна зразумела, што прынясе больш карысці, калі будзе займацца элегантным жаночым тату.

— Жаданне зрабіць малюнак на целе ў першую чаргу ўзнікае, калі чалавек хоча схаваць тое, што яму ў ім не падабаецца. Да мяне пачалі ўсё часцей прыходзіць жанчыны з просьбай перакрыць рубцы, расцяжкі, якія засталіся пасля родаў. Гэта былі няпростыя выпадкі. Маляваць на скуры з рубцамі — складаней, чым на чыстай. Але я бачыла эмацыйны стан жанчын пасля працэдуры. Яны сыходзілі ад мяне шчаслівымі. Звычайна пасля нейкіх сур'ёзных хвароб, калі чалавек выжыў, шрамы яго ўжо не асабліва хвалююць, але ж можна не проста жыць далей, але жыць якасна. Так я і прыйшла ад звычайнай татуіроўкі да эстэтычнай карэкцыі.

Татуіроўка сама па сабе «ходзіць» па мяжы. Сёння яна падабаецца — заўтра яе выводзяць лазерам. Майстар робіць сваю працу прыгожа і якасна, але прыярытэты ў чалавека памяняліся, і ён больш не хоча жыць з гэтым малюнкам на скуры. Калі ты робіш эстэтычную карэкцыю, такога ніколі не будзе. Таму што жанчына шчаслівая атрымаць малюнак, які выглядае лепш, чым яе рубец.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Працяг тэмы

# Чыноўнікі пайшлі насустрач бацькам

## «Звязда» дапамагла сталічнай сям'і атрымаць пасведчанне шматдзетнай



Фота Надзеі БУЖАН.

**Месяц таму «Звязда» расказвала гісторыю мінскай сям'і Шарапавых, якую не хацелі прызнаваць шматдзетнай. Вольга і Уладзіслаў выхоўваюць траіх: двух сыноў і дачку. Але ад розных шлюбаў. Мясцовая адміністрацыя палічыла, што адсутнасць блізкага сваяцтва не дае сям'і права атрымаць пасведчанне шматдзетнай і, адпаведна, пэўныя льготы. Бацькі напісалі ў газету, спадзеючыся паўплываць на сітуацыю. Нядаўна Вольга патэлефанавала з радаснай навіной: пасведчанне ў яе на руках!**

Нагадаем, што аспрэчыць рашэнне адміністрацыі Ленінскага раёна сталіцы Шарапавы спачатку спрабавалі самастойна. Вольга пісала скаргу ў Мінгарвыканкам, пасля якой жанчыну запрасілі на паўторнае пасяджэнне ў мясцовую адміністрацыю па яе пытанні. Але ў выніку зноў адмовіліся выдаваць пасведчанне, нягледзячы на рэкамендацыі гарадскога камітэта дзейнічаць у інтарэсах сям'і.

У гэтай сітуацыі павінны былі ўлічыць і тое, што маці аднаго з хлопчыкаў (былая жонка Уладзіслава) памерла, і тое, што дзеці цяпер жывуць у добрых умовах. Але чамусьці гэтыя акалічнасці засталіся па-за ўвагай раённых чыноўнікаў.

Пасля выхаду публікацыі Вользе прыйшоў ліст з гарадскога выканаўчага камітэта. Там пісалася, што ў выпадку Шарапавых Мінгарвыканкам лічыць магчымым выдачу пасведчання. Адміністрацыю Ленінскага раёна (пытанне аб прызнанні сям'і шматдзетнай разглядаецца менавіта мясцовымі органамі) абавязалі адмяніць папярэдняе рашэнне і пайсці насустрач сям'і.

Сітуацыя вырашылася, але ў нас засталося шмат пытанняў. Ці з'яўляецца гэты выпадак выключэннем? Якая сям'я ў прынцыпе лічыцца шматдзетнай? Калі бацькам, што выхоўваюць траіх, могуць адмовіць у выдачы пасведчання? Па тлумачэнні мы звярнуліся ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

— Артыкулам 62 Кодэкса аб шлюбе і сям'і вызначана, што шматдзетнай з'яўляецца сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш дзяцей. Адна з падстаў узнікнення праў і абавязкаў сям'і — зарэгістраваны шлюб. Пры яго заключэнні маці (мачаха), бацька (айчым), а таксама іх дзеці, у тым ліку ўсыноўленыя (удачароныя), пасынкі і падчарыцы становяцца членамі адной сям'і і ўлічваюцца ў яе складзе пры вызначэнні права на выдачу пасведчання шматдзетнай сям'і, — каментуе **кансультант аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі ведамства Святлана КОВАЛЬ.**

Пацвердзіць выхаванне нярodных дзяцей можна копіяй рашэння суда аб усынаўленні, аб тым, з кім з бацькоў пражываюць малыя пасля разводу, і іншымі дакументамі.

Адмовіць у выдачы пасведчання мясцовыя органы маюць права, напрыклад, калі дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы ці бацькі не забяспечваюць ім належнае выхаванне і ўтрыманне. Разам з тым такія рашэнні могуць быць перагледжаны ў далейшым у выпадку паляпшэння сітуацыі (працаўладкавання бацькоў, наведвання непаўналетнімі ўстаноў адукацыі).

Святлана Коваль заўважае, што па пытаннях выдачы пасведчання ў міністэрства ад грамадзян паступаюць адзінкавыя звароты, у асноўным тлумачальнага характару.

У выпадку з Шарапавымі праблема ўзнікла з-за розных трактовак закона. Магчыма, варта было б удакладніць паняцце шматдзетнай сям'і, каб пазбегнуць спрэчных момантаў?

— Такога ў планах няма. Я не чуў, каб паступалі нараканні на гэты артыкул, — адказаў **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ.**

Дэпутат таксама адзначыў, што калі з трактоўкай паняцця шматдзетнай сям'і і ўзнікаюць праблемы, гэта адзінкавыя выпадкі. «Жыццё ёсць жыццё, заўсёды ёсць месца выключэнням, бо прадугледзець законам усе акалічнасці немагчыма. Уносіць змены ў кодэкс варта было б, калі б гэтыя выключэнні мелі масавы характар. Але да нас падобных скаргаў не паступала».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

■ Ёсць праблема

# ДРЭННЫЯ ДЗЕТКІ

## Хто трапляе на ўлік непаўналетніх



**Летась у школе, дзе вучыцца мой сын, надарыўся скандал. Адзін з вучняў "пачараваў" на камп'ютары з фатаграфіямі аднакласніка і размясціў іх у інтэрнэце. Непрыстойныя здымкі пэўны час маглі назіраць усе вучні, што заходзілі ў сацыяльныя сеткі. Неўзабаве пра гэта даведалася і маці пакрыўджанага хлопчыка. Справу замяць не ўдалося. Пасля яе звароту ў міліцыю дурны жарт пачаў разглядацца як распаўсюджванне дзіцячай парнаграфіі. Сям'і вінаватага давялося плаціць штраф за «фотажабы». А сам «жартаўнік», якому 12 гадоў, быў вызвалены ад крымінальнай адказнасці, але пастаўлены на ўлік непаўналетніх.**

### Без флікера, але з «чупа-чупсам»

Здавалася, недарэчная сітуацыя. Але, на жаль, даволі часта дзеці не заўважаюць, дзе тая мяжа, за якую нельга пераступаць. І як разабрацца, дзе хлопчыкі і дзяўчаткі заслугоўваюць пакарання, а дзе варта проста дапамагчы ў заблытанай сітуацыі. За што могуць паставіць на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх і чым гэта можа пагражаць «дрэнным дзеткам», спрабуем разабрацца разам з **начальнікам аддзялення прафілактыкі правапарушэнняў непаўналетніх УАПП УУС Мінаблвыканкама Аляксандрам ЧАРНЫМ.**

— У законе прапісана, за якія адміністрацыйныя парушэнні непаўналетнія могуць быць пастаўлены на ўлік. Гэта даволі вялікі пералік. Але кожную сітуацыю мы разбіраем індывідуальна, каб не траўмаваць псіхіку дзяцей і бацькоў. Тэарэтычна можна паставіць на ўлік нават за пераход вуліцы без флікера. Тут можна сказаць, што здзейснена правапарушэнне, і, на жаль, на сёння статыстыка па дзіцячым траўматызме ў дарожна-транспартных здарэннях не зусім добрая. Безумоўна, неабходна даводзіць да бацькоў, што святлоадбівальны элемент засцеражэ дзіця. Але ці трэба караць за флікер? А ёсць і такія выпадкі, як, напрыклад, распіванне спіртных напояў, ужыванне наркотыкаў, калі пастаноўка на ўлік дазваляе засцерагчы падлетка, каб ён не здзейсніў больш цяжкіх злачынстваў.

***— З якога ўзросту дзеці ставяцца на ўлік?***

— Некаторыя стаяць на ўліку з 11—12 гадоў. Да самых юных трэба падыходзіць спагадліва. Напрыклад, пяці-васьмігадовая дзяўчынка ўзяла ў краме «чупа-чупс». Так, яна здзейсніла дробны крадзеж, але мы выдатна разумеем, што зрабіла гэта неўсвядомлена. Пакараннямі ў такім узросце ні на што паўплываць не зможам. Тут больш трэба працаваць з бацькамі, каб яны вучылі дзяцей таму, што чужое браць нельга. На сёння ў законе не агаворана ніжняя мяжа ўзросту для пастаноўкі на ўлік.

**Бацькоў павінен насцярожыць слэнг у перапісцы дзіцяці, напрыклад, такія словы, як «закладкі», «спайсы», «кропкі», «трава».**

***— Ці могуць паставіць на ўлік за бойку? І ці варта бацькам, чыіх дзяцей аднагодкі збіваюць у школе, звяртацца ў міліцыю?***

— Працэс распачынаецца толькі па патрабаванні, калі бацькі звернуцца, напрыклад, са скаргай, што ў дзіцяці ёсць пашкоджанні, і яны просяць прыцягнуць вінаватага да адказнасці. Калі паступае заява, супрацоўнікі інспекцыі праводзяць праверку. Даецца прававая ацэнка дзеянням дзяцей. Калі будзе відаць, што вінаваты наўмысна ўдарыў пацярпелага, пашкодзіў рэчы, парваў адзенне, гэта можа разглядацца як правапарушэнне. Адміністрацыйны працэс у адносінах да непаўналетняга не распачынаецца, але адказнасць панясуць яго бацькі, калі пацярпелы бок будзе на гэтым настойваць. Адпаведна, дзіця, якое здзейсніла правапарушэнне, паставяць на ўлік. Але справу можна спыніць прымірэннем на любой стадыі.

***— Якія могуць быць выпадкі насілля ў дачыненні да дзіцяці з боку аднагодкаў?***

— Псіхалагічнае. Калі дзіця раптам адмаўляецца ісці ў школу, закрываецца, гэта павінна насцярожыць бацькоў, ці не зневажаюць яго ў школе. З такімі сітуацыямі бацькі часам таксама звяртаюцца ў інспекцыю. Але, як правіла, такія справы спыняюцца. Найперш з гэтай праблемай трэба звярнуцца да класнага кіраўніка, псіхолага. І калі ў класе выявіліся дзеці, якія верхаводзяць, прыніжаюць іншых, на іх можна паўплываць. Часам дастаткова і гутаркі з такімі лідарамі ці іх бацькамі. А калі мікраклімат у класе не палепшыцца, можна развесці такіх дзяцей па розных класах.

***— Што чакае «дрэнных дзетак», якія трапілі пад увагу міліцыі?***

— На ўліку падлетак можа стаяць мінімум 6 месяцаў. Яго штомесячна будуць наведваць інспектары па месцы жыхарства і працаваць як з ім, так і з яго бацькамі. Безумоўна, па-іншаму да такіх вучняў ставяцца ў школе, з імі займаецца псіхолаг. Многае залежыць і ад паводзін падлетка, калі ён здзейсніць іншыя правапарушэнні, будуць прымацца адпаведныя меры. Натуральна, ёсць і тыя, хто не выпраўляецца. І такія паводзіны могуць давесці да турмы. Праўда, калі дзіця не дасягнула 14 гадоў, яно вызваляецца ад крымінальнай адказнасці. Калі непаўналетнія некалькі разоў здзяйсняюць адміністрацыйныя парушэнні, ужываюць наркотыкі, іх перыядычна застаюць за распіваннем спіртных напояў, ці яны былі задзейнічаны ў сур'ёзным злачынстве, іх могуць накіраваць у спецыяльную ўстанову. У Мінскай вобласці яна знаходзіцца ў пасёлку Крывічы Мядзельскага раёна. Гэта накшталт турмы для дзяцей. Аднолькавая вопратка, рэжым, ніякіх мабільнікаў, бацькоў можна ўбачыць у лепшым выпадку раз на месяц і тое за добрыя паводзіны. Навучацца ва ўстанове закрытага тыпу непаўналетнія могуць максімум два гады альбо знаходзіцца там да дасягнення паўналецця.

Дрэнныя паводзіны ў дзяцінстве могуць негатыўна адбіцца ў будучыні. Так, хлопец, што стаяў на ўліку, не зможа паступіць у навучальную ўстанову прававвога характару, працаваць у міліцыі, а калі пойдзе ў армію, трапіць не ў тыя войскі, якія б хацеў.

### Гульня «ў крутых пацаноў»

Сярод самых распаўсюджаных злачынстваў, якія здзяйсняюць падлеткі Мінскай вобласці, — крадзяжы. Цягнуць усё, што можна ўявіць, ад мабільнікаў да запчастак, інструментаў і веласіпедаў.

Часта падлеткі «робяць шкоду» ў кампаніях з больш дарослымі сябрамі. Многія пры гэтым не ўсведамляюць, чым можа закончыцца такая гульня «ў крутых пацаноў». Адна са спраў, у якой фігуравалі непаўналетнія, распачата ў кастрычніку. Ва Узздзе чацвёра навучэнцаў сельгастэхнікума сагналі машыну, сярод іх быў і хлопец 1999 года нараджэння.

На жаль, летась не абышлося і без самых цяжкіх злачынстваў, з удзелам падлеткаў. У Салігорску паўналетні і непаўналетні залезлі ў дом да бабулі і так моцна яе збілі, што старая памерла. А ў Барысаве падлетак стаў саўдзельнікам забойства разам са сваім бацькам, прычым хлопец ужо стаяў на ўліку ў інспекцыі.

— Безумоўна, здзяйсняць правапарушэнні і злачынствы могуць розныя дзеці, але большы працэнт тых, хто трапляе на ўлік, — з сем'яў, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане, дзе бацькі злоўжываюць спіртнымі напоямі. Часта цяжкім падлеткам самім патрэбна дапамога. Можа, іншым разам дзіця і ўрокі не зрабіла таму, што ўвесь вечар праседзела пад ложкам, пакуль бацька ганяў, біў маці. Такім хлопчыкам і дзяўчатам не ўдзяляецца ўвага, яны бачаць, што ў аднакласнікаў і адзенне можа быць лепшае, і тэлефоны новыя, і ім хочацца таго ж самага. Праблемныя могуць быць і дзеці ў няпоўных сем'ях ці там, дзе тата і мама забываюцца пра свае абавязкі, ухіляюцца ад выхавання. Ні школа, ні інспекцыя не змогуць вывесці дзіця ў нармальны стан, каб яно стала законапаслухмяным, калі выпадае адно звяно — бацькі, — заўважае Аляксандр Чарны.

***— А што могуць зрабіць бацькі, каб засцерагчы дзіця ад небяспекі?***

— Кантроль інтэрнэту адназначны. Перапіска — самае лепшае люстэрка любога чалавека, які вядзе актыўнае жыццё ў камп'ютарным свеце. Часам падлеткі вышукваюць у інтэрнэце кампаненты выбуховага ўстройства, безумоўна, гэта павінна насцярожыць: для чаго яны гэта робяць і з кім падтрымліваюць кантакты. Бацькоў павінен насцярожыць слэнг у перапісцы дзіцяці, напрыклад, такія словы, як «закладкі», «спайсы», «кропкі», «трава». Як правіла, у 99 працэнтах выпадкаў становіцца ясна, ці ўжывае падлетак наркотыкі. Пажадана, каб бацькі ведалі паролі і доступ да акаўнтаў дзіцяці ва "УКантакце", «Фэйсбуку», «Аднакласніках», і пры гэтым каб яно не здагадвалася, што яго перапіска правяраецца. Камп'ютар дома адзін, падлетак адкрывае свае старонкі і, як правіла, не выходзіць з іх. Але, як толькі даведваецца, што бацькі лазяць у яго акаўнт, робіцца ўсё, каб тыя нічога не знайшлі, — перапіска выдаляецца, мяняюцца паролі. Трэба быць уважлівым да паводзін дзіцяці. Насцярожыць павінны раздражнёнасць, непрадказальнасць, неадэкватнасць. Калі дзіця ўжывае наркотыкі, мяняецца міміка, з'яўляецца жэстыкуляцыя ці наадварот яно становіцца вельмі замкнёным. І першае, на што трэба звярнуць увагу, — вочы, моцна расшыраныя зрэнкі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# Гэта рана не загойваецца...

**Калі-нікалі я бяру ў рукі наш сямейны альбом і, углядаючыся ў фотаздымкі, адчуваю, як шчыміць на душы, як тужліва пульсуе памяць, як перад вачыма нібы праплываюць старонкі жыцця — майго і дарагіх мне людзей. Так было і гэтым разам...**



Мне споўнілася шэсць гадоў, калі наша вёска Куклічы, што ў Чачэрскім раёне, апынулася пад фашысцкім ботам. Дзіцячая памяць учэплівая і надоўга — а здараецца, і назаўсёды — утрымлівае ў сабе трагічныя эпізоды. Такім, напрыклад, з'яўляецца той дзень — 15 студзеня 1943-га (мне тады ўжо было амаль восем гадоў), — калі з райцэнтра ў Куклічы прыбыў нейкі вялікі спецыяльны атрад з сабакамі і бацьку як старасту вёскі было загадана тэрмінова сабраць людзей на сход. Маці ўстрывожылася: не да дабра гэта, сказала. Бо немцы ў нашу лясную вёску наведваліся зрэдку і толькі днём, таму што баяліся начных вылазак партызан. А тут цэлы атрад. З сабакамі.

Маці скамандавала старэйшым дзецям — Архіпу, Надзі і Алёшу — бегчы ў лес, куды ўжо кінуліся і некаторыя іншыя вяскоўцы. А мяне (я ў той час моцна хварэў) паклала на падлогу і накінула цэлую кучу розных лахманоў, рыззя і строга наказала, каб не варушыўся, калі хто зойдзе ў хату. Сама ж накіравалася на сход.

Нашы бацькі — Яфрэм Фёдаравіч і Кацярына Піменаўна — да вайны працавалі ў мясцовым калгасе і карысталіся вялікай павагай у людзей. І калі немцы на парадак дня паставілі пытанне, хто ў вёсцы будзе старастам, усе назвалі майго бацьку. Адмовіцца ад гэтай «пасады» азначала вынесці смяротны прысуд самому сабе.

Бацька неўзабаве наладзіў сувязь з партызанамі, падключыўшы да гэтага самых надзейных аднавяскоўцаў, дакладваў народным мсціўцам аб сітуацыі ў навакольных населеных пунктах і настроі людзей, аб рознага роду прымусах і здзеках фашыстаў. Маці ж выпякала хлеб, які трапляў у партызанскі атрад. Неаднойчы лясныя салдаты мелі магчымасць мыцца начамі ў лазні.

Але аднойчы паліцай па прозвішчы Галубоўскі падпільнаваў бацьку, калі ён па лесе вёз у мяшках боханы хлеба. Так у Куклічах з'явіўся карны атрад.

Маўклівы і перапалоханы натоўп вяскоўцаў у акружэнні аўтаматчыкаў, грозна ашчэраныя пашчы аўчарак, што рвуцца на людзей з павадкоў і гатовыя загрызці іх... Крыклівы афіцэр рэйха з паперай у руках, голас якога падымаецца да высокіх нот... Заглядваючы ў той спіс, ён называе прозвішчы, і з натоўпу выцягваюць Яўмена Дзямідавіча Тарасенку, Яфрэма Фёдаравіча, Уладзіміра Міхайлавіча, Пятра Яфімавіча і Гарпіну Ігнатаўну Сувалавых.



Нашай маме пашанцавала (калі можна так сказаць). Яна стаяла побач з маладым салдатам, які з нейкай прычыны спытаў, колькі ў яе «кіндэраў». Яна паказала чатыры пальцы (пра пятага, Дзмітрыя, які ваяваў у дзеючай арміі, вядома ж, змаўчала). І тады ён даў ёй фуфайку і загадаў: «Шнэль, нах хаўзэ» (хутка дадому). Але тут са словамі «брот, брот» (хлеб, хлеб) у маці ўчапіўся той самы прыхвасцень Галубоўскі. Салдат паўтарыў загад, але паліцай зноў за сваё. І тады немец з такой сілай штурхануў Галубоўскага ў грудзі, што той паляцеў потарч на зямлю. Мама то ціхай хадой, то подбегам пераадолела палавіну дарогі (прыкладна 250 м), як наваколле разарвалі аўтаматныя чэргі. Яна аб усім здагадалася і ўпала, страціўшы прытомнасць. Доўгае знаходжанне ў лужыне каля калодзежа (тады была адліга) выклікала цяжкую хваробу, а праз чатыры месяцы мама памерла...

Так пачалося наша сіроцкае жыццё. На каго было спадзявацца? Праўда, дапамагалі родзічы, спагадлівыя аднавяскоўцы, чым маглі. Але ў іх саміх было па некалькі галодных ратоў і яны самі перабіваліся з вады і шчаўя на скарынку хлеба. Бацькам і маці для мяне, Надзі і Алёшы стаў Архіп, якому не было яшчэ 17 гадоў. Ён адправіў нас у школу. Але я быў такі хваравіты, што ледзь трымаўся на нагах, і мая настаўніца Арына Якаўлеўна Тарасенка падкормлівала мяне і адагравала мае рукі. У школу я хадзіў у такім абутку: на адной назе — стары чаравік, на другой — галош. Голад, холад, нястача... Каб выкараскацца з яе, сваякі ўгаварылі Архіпа ажаніцца, але гэта не вельмі дапамагло: у разбураным калгасе заробкі былі як кот наплакаў. І тады Алёша і я апынуліся ў дзіцячым прытулку, які знаходзіўся ў вёсцы Паддабранка Гомельскага раёна. Там мы вельмі сумавалі, хадзілі паўгалодныя. Ад такога жыцця Алёша збег дадому і, каб яго не зlавілі па дарозе і не вярнулі назад, больш за стокіламетровую вандроўку ён завяршыў за дзесяць дзён. Па лясах, балотах, лугавінах... Ад чаго падхапіў рэўматызм і пайшоў на той свет у 54-гадовым узросце.

Пазбавіўшыся апекі старэйшага брата, я адчуў такую няўтульнасць у тым дзіцячым доме, што плакаў дзень і ноч. Тады я, як той чэхаўскі Ванька Жукаў, напісаў слёзнае пісьмо Архіпу: «Богам прашу, калі ласка, забяры мяне дадому». Так я зноў апынуўся ў Куклічах. Але не надоўга. Бо там паранейшаму гаспадарылі голад, холад і нястача.

У выніку ў верасні 1944 года мы з Алёшам былі адпраўлены ў дзіцячы дом у вёсцы Глыбочыца Чачэрскага раёна. А потым у маі 1945-га нас перавялі ў Карманскі спецыяльны дзіцячы дом. Там умовы жыцця былі нашмат лепшыя. І там, у г.п. Карма, я адчуў матчыну пяшчоту завуча дзіцячага дома Настассі Ларыёнаўны Чэчыкавай. У яе не было сваіх дзяцей, і яна нярэдка брала мяне да сябе дадому. Гэта быў вялікай душы чалавек. Я лічыў яе сваёй другой матуляй і цяпер так лічу.

У 1950 годзе я скончыў сямігодку з добрымі веданмі, і паўстала пытанне: што далей? Маіх аднакласнікаў адправілі ў рамесныя вучылішчы, а мне рэкамендавалі паступаць у педагагічнае, бо на педсавеце Настасся Ларыёнаўна расказала, што я часцяком «праяўляў настаўніцкія здольнасці»: збіраў групку малодшых дзяцей, даваў ім заданні, правяраў іх веды і ставіў ім адзнакі.

Яна сама павезла мяне ў Гомель, дзе я паспяхова здаў экзамены. А напярэдадні навучальнага года павезла мяне ў Рэчыцу, дзе, у адрозненне ад Гомеля, пры педвучылішчы быў інтэрнат, у якім жылі такія ж дзетдомаўцы, як і я.

Пасля заканчэння Рэчыцкага педвучылішча я працаваў настаўнікам у Драгічынскім раёне. Потым — служба ў арміі, вучоба на філалагічным факультэце Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Чкалава. Пасля сканчыў яшчэ ў Мінску дэфекталагічны факультэт педінстытута імя М. Танка, атрымаўшы спецыяльнасці лагапеда і настаўніка-дэфектолага. Так вось і атрымалася, што сельскім і гарадскім вучням я прысвяціў 46 гадоў свайго жыцця. Неўзабаве мне споўніцца 82 гады.

Пасля смерці любай жонкі жыву ў Гомелі адзін у кватэры. З'яўляюся інвалідам II групы. З-за хворых ног дрэнна рухаюся, рэдка бываю на свежым паветры. Вельмі падводзіць мяне яшчэ і слых. Адна ўцеха, што пра мяне не забываюць любы мой пасынак Валянцін, які даўно стаў родным, а таксама пляменнікі.

Здаецца, апошнім часам усё наладжваецца: і пенсія добрая, і да хлеба ўсё ёсць. Адна толькі балючая рана: ніколі ўжо не ўдасца пабачыцца (хіба толькі на нябёсах) з бацькамі, Дзмітрыем, які даслужыўся да палкоўніка, Алёшам і Архіпам. 86-гадовая сястра Надзя, якую Дзмітрый у свой час забраў да сябе на Далёкі Усход, па-ранейшаму пражывае там. І вось гэтыя даўнія фотаздымкі, на адным з якіх сям'я Дзмітрыя, а на другім — Архіп, Алёша і я.

**Іван СУВАЛАЎ**

■

## ВІНШУЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ!

**2016 год завяршыўся — таму самы час падвесці вынікі конкурсу, які так палюбіўся нашым чытачам (аб гэтым сведчаць здымкі, якія прыходзяць на адрас рэдакцыі, а таксама званкі з пытаннем: «Чаму вы не ставіце маё фота з гісторыяй?»). А не ставім — бо не дайшла яшчэ яго чарга (чакайце). Другая прычына: строгі конкурсны адбор. Часам чытачы дасылаюць пашпартныя здымкі альбо вельмі «афіцыйныя» гісторыі да фота, якія нагадваюць больш выпіску з энцыклапедычнага даведніка. Але, на шчасце, такіх адзінкі. Збольшага пажоўклыя ад часу фотаздымкі вельмі цікавыя, а гісторыі — вельмі кранальныя. Амаль усе лісты нам пішуць ад рукі. І хоць гэта дадатковая праца для нашых наборшчыкаў, асабіста я, калі шчыра, вельмі люблю іх атрымліваць. Бо ў іх, у адрозненне ад надрукаваных, ёсць нейкая загадка і настальгія.**

**Сярод такіх кранальных і запамінальных — лісты нашых пераможцаў. На гэты раз іх трое: Валянціна ГУДАЧКОВА з Жыткавічаў («Адна дарога ў маладосці», «Звязда» ад 28.04.2016), Таіса НЕСЦЯРОВІЧ з вёскі Кляннік Смалявіцкага раёна («Шчыравалі дружна, з запалам», «Звязда» ад 10.03.2016) і Зоя ВЯЛЬКО з вёскі Хораства («Іх запал вядзе па жыцці», «Звязда» ад 11.02.2016). Цёплыя і ў прамым, і ў пераносным сэнсе прэзенты ім неўзабаве (спадзяёмся, разам са свежым нумарам «Звязды») прынясуць паштальёны. Здымкі, якія гэтыя жанчыны даслалі на конкурс, — сапраўдная знаходка для этнографаў! Калі вы іх не бачылі, раю пагартаць падшыўку «Звязды».**

**Пагартаць і, магчыма, натхніцца: дастаць з трэльяжа свой сямейны альбом і здзейсніць вандроўку ў мінулае. Бо конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. І мы па-ранейшаму чакаем ад вас лістоў. Цікавыя карткі (не больш за тры) з невялічкай (!) гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.**

■ Кіроўцам на заметку

# ШТО ПАВІННА БЫЦЬ У НОВАЙ АПТЭЧЦЫ

**На жаль, не ўсе кіроўцы ведаюць, што з пачатку года да аўтамабільных аптэчак — новыя патрабаванні. З ліку такіх я і мой сусед. Паехалі мы днямі праходзіць тэхагляд. Але не прайшлі з першага разу: склад нашых аптэчак не адпавядаў удасканаленаму спісу. Сусед у той жа дзень паехаў у аптэку і купіў новую. Заплаціў за яе дзесяці 13 рублёў. Я ж вырашыў сэканоміць: перагледзеў ужо наяўную аптэчку і дакупіў усё неабходнае.**

Са старой камплектацыі зніклі валідол, гліцэрыл трынітрат, ацэтылсаліцылавая кіслата, дратаверын, ларатадзін, метамізол натрый, парацэтамол, раствор сульфацэтаміду, цытрамон. Гэта тлумачыцца тым, што ў аўтамабілі немагчыма забяспечыць належнае захоўванне гэтых прэпаратаў. Змены таксама закранулі перавязачныя сродкі: іх колькасць павялічылася.

Перш чым пайсці ў аптэку, я знайшоў у інтэрнэце пастанову Міністэрства аховы здароўя № 80 і перапісаў адтуль спіс неабходных медыкаментаў (які потым параўнаў са сваім старым). Вось гэты новы пералік, можа, каму спатрэбіцца:

- амонію раствор 10% — 1 мл №10 (або 10 мл (40 мл) — 1 упакоўка (або 1 флакон);
- ёду спіртавы раствор 5% — 1 мл №10 (або 10 мл (40 мл) — 1 упакоўка (або 1 флакон);
- бінты нестэрыльныя: 5 м х 5 см і 5 м х 10 см — па 2 упакоўкі;
- бінты стэрыльныя 5 м х 10 см — 1 упакоўка;
- бінт медыцынскі эластычны нестэрыльны трубчасты №1, 3 ці 6 —1 упакоўка;
- вата гіграскапічная стэрыльная 50 г — 1 упакоўка;
- жгут кроваспынальны Эсмарха — 1 упакоўка;
- лейкапластыр бактэрыцыдны: 2,5 х 7,2 см — 3 упакоўкі, 4 х 10 см (або 6 х 10 см) — 1 упакоўка;
- лейкапластыр катушачны 1 х 500 см (або 2 х 500 см) — 1 упакоўка;
- нажніцы тупаканцовыя 14 см — 1 упакоўка;
- пакет гіпатэрмічны ахаладжвальны — 1 упакоўка;
- пальчаткі латэксныя нестэрыльныя (стэрыльныя) №8 (L) — 1 пара;
- сурвэткі стэрыльныя памерам не менш за 16 х 14 см (45 х 29) №1 — 4 упакоўкі.

**Павел,** *Віцебская вобласць*

■

# МАЛЮНАК НА ЦЕЛЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ»).*

— У большасці сваёй, — расказвае татуіроўшчыца, — у жанчыны проста ёсць шрам, і яна хоча яго закрыць. Вядома, я магу нешта падказаць, параіць, бо сам рэльеф рубца часам дыктуе нейкі малюнак. Але, напрыклад, лінейнае перакрыццё прыцягне яшчэ больш увагі. Таму малюнак у любым выпадку павінен быць большым, быццам пад ім нічога няма, а гэта — проста татуіроўка. Камусьці падабаюцца кветкі, камусьці — матылькі, птушкі. Я працую толькі з такімі, «пазітыўнымі», малюнкамі.

**Гэта дарагога каштуе: бачыць, як жанчыны, якія перамаглі такую страшную хваробу, вяртаюцца шчаслівымі да жыцця.**

Ала расказвае, што ў адной з яе кліентак былі на целе вялікія апёкі, якія яна атрымала яшчэ ў раннім дзяцінстве. «Мы зрабілі на іх архідэі. Прычым у першы год кветкі былі ахраматычныя — карамельныя, крэмавыя, а на наступны я перафарбавала іх у ружовы, бэзавы колер».

## НЕ МАГУ БРАЦЬ ЗА ГЭТА ГРОШЫ

Татуіроўшчыца прызнаецца, што спачатку практыкі ў яе было не так многа. Часцей за ўсё да яе прыходзілі жанчыны з просьбай падкарэктаваць рубец пасля ўстаўкі імпланта.

— Са з'яўленнем інтэрнэту зваротаў стала больш. Магчыма, нейкую інфармацыю пачалі даваць сваім пацыенткам самі ўрачы. Бо жанчынам, якія перажылі рак грудзей, часта цалкам выдаляюць залозу і ўжо на яе месца ўстаўляюць імплант. Аднак арэолы ўрачы зрабіць не могуць.

У мяне была адна жанчына з Гомеля, якая расказвала, што кожны год, калі яна ўжо пасля аперацыі прыходзіла на кансультацыю ў бальніцу, ёй казалі: «Мы сваю працу зрабілі добра. Калі ж ты нарэшце сходзіш да татуіроўшчыка і намалюеш сабе арэолу?» Мы і самі, калі глядзім на такую жанчыну, напрыклад, у лазні, міжволі заўважаем, што ў яе не хапае саска — і нам гэта здаецца няправільным. У нас падсвядома ўспрыманне спрацоўвае так, што ў чалавека павінна быць дзве рукі, дзве нагі, дзве арэолы. Калі чагосьці не хапае, значыць, нешта не так.

Цяпер я працую з самым інавацыйным абсталяваннем, якое ёсць у свеце. То-бок не проста падбіраю татуіровачныя фарбы: у мяне цэлая палітра для арэол любога тыпу. Як жывапісец, я магу падбараць любое адценне. Складанасць не ў тым, каб проста намаляваць дзве арэолы. Важна падбараць адну пад другую, скапіраваць іх. Бо часцей за ўсё да мяне прыходзяць жанчыны, якім выдалілі адну з грудзей і ўставілі імплант. Тут ужо важныя мастацкая адукацыя і навыкі колеразнаўства. Наогул, 3D-арэола — гэта гульня са святлом і ценем. Безумоўна, звычайнаму чалавеку любы аб'ёмны малюнак здаецца складаным, для мастака ж гэта нармальная практыка. Гэта як намаляваць шарык. Аднак пачынаючаму тату́-майстру нельга проста ўзяць і зрабіць сасок.


Фота Надзеі БУЖАН.

Аднойчы Ала вырашыла для сябе, што прынясе больш карысці, калі адыдзе ад брутальнага мужчынскага тату́ і будзе займацца эстэтычнай карэкцыяй.

Для гэтага трэба ведаць асноўныя правілы. Выкарыстоўваць спецыяльныя пігменты, іголкі і тэхналогіі, каб не нашкодзіць чалавеку.

— Яшчэ, — працягвае тату́-майстар, — трэба памятаць, што любыя перакрыцці рубцоў магчымыя, калі яны ўжо сталі белымі. А для гэтага павінна прайсці мінімум паўгода з моманту аперацыі.

Акрамя гэтага, Ала ўпэўнена: браць за такую працу грошы проста немагчыма.

— Чалавек пераадолеў рак, патраціў шмат сродкаў на лекі і аднаўленне. Як я магу прасіць з яго яшчэ якую-небудзь аплату? Таму я раблю арэолы бясплатна. І задавальненне, прызнаюся шчыра, атрымліваю значна больш, чым ад камерцыйнай працы.

## «НЕКАТОРЫЯ ЖАНЧЫНЫ ЦЯПЕР ДЛЯ МЯНЕ ЯК СЯМ'Я»

— Неяк я ўдзельнічала ў акцыі, асноўнай мэтай якой была дапамога жанчынам пасля анкалогіі. Яе падтрымала шмат татуіроўшчыкаў не толькі з Мінска, але і з абласных цэнтраў. Некаторыя абсалютна бясплатна малявалі жанчынам бровы і стрэлкі на вачах падчас хіміятэрапіі. Каб нават у такі складаны перыяд жыцця яны маглі адчуваць сябе прыгожымі.

**У нас падсвядома ўспрыманне спрацоўвае так, што ў чалавека павінна быць дзве рукі, дзве нагі, дзве арэолы. Калі чагосьці не хапае, значыць, нешта не так.**

Калі ў сацыяльных сетках вы бачыце ў тату́-майстра ружовую стужку — міжнародны сімвал, які падтрымлівае праграму барацьбы супраць раку малочнай залозы, — яны адгукнуцца і зробяць татуіроўку жанчыне пасля анкалогіі бясплатна. І гэтага зусім не трэба саромецца. Так я кажу заўсёды, калі бываю на сустрэчах жанчын, якія перамаглі рак грудзей.

У большасці краін падобныя тату́ робяцца бясплатна, таму што пагашаюцца медыцынскай страхоўкай. У нас медыцынская сацыяльная праграма, на жаль, нічога не пагашае.

— У мяне нядаўна была жанчына, — успамінае Ала, — якая заканчвала праходзіць хіміятэрапію. У яе не было ні броваў, ні веек. Я рабіла ёй міжвейкавую растушоўку. А праз месяц яна зноў прыйшла да мяне, і з радасцю ўбачыла, што яе ўласныя вейкі да яе вярнуліся — і нават выраслі ў тры рады! І гэта дарагога каштуе: бачыць, як жанчыны, якія перамаглі такую страшную хваробу, вяртаюцца шчаслівымі да жыцця.

Што датычыцца мужчын і іх успрымання такіх працэдур, то я скажу так: калі мужчына кахае жанчыну, калі яна яму важная, думаю, ён у любым выпадку падтрымае яе рашэнне, што б яна ні зрабіла. Калі ёй ад гэтага лепш, то і яму спакайней. Многія да мяне прыходзілі са словамі «Муж мяне і такую любіць», але ж пры гэтым самі саромеюцца свайго цела: не могуць распрануцца ні ў лазні, ні на пляжы. Калі жанчына закрывае рубец на сваім целе, яна становіцца больш упэўненай у сабе.

— Калі бачыш чалавека часта, калі ведаеш яго гісторыю, з-за якой ён прыйшоў да цябе, — кажа Ала, — некаторыя жанчыны становяцца табе як сям'я.

**Ганна БАГІНО.** *bahino@zviazda.by*






Калі жанчына закрывае рубец на сваім целе, яна становіцца больш упэўненай у сабе.

### ● МЕРКАВАННІ НА ТЭМУ

**Вера:**

— Любая жанчына хоча выглядаць добра. Асабліва пасля цяжкай хваробы, калі тваё цела кажа табе адваротнае: ты непрыгожая і нежаданая.

Я ўдзячная Але за яе акцыю, за тое, што яна дапамагае жанчынам абсалютна бясплатна. Я доўга сумнявалася, ці патрэбна мне татуіроўка: чалавек, які перажыў анкалогію, хоча як мага хутчэй пра яе забыцца, не вяртацца да «балючага» месца. Але Ала мне растлумачыла, што татуіроўка дапаможа зрабіць гэта значна хутчэй — зноў адчуць сябе, як і раней, прыгожай. Зусім хутка мы сустрэнемся, каб зрабіць мне тату́.

**Вольга:**

— Мае аднасіны да шрамаў на грудзях з гадамі змяняліся. Упершыню перажыла аперацыю ў 2011 годзе. Вядома, я думала, што мне, як зусім юнай дзяўчыне, накладуць касметычныя швы, якія з цягам часу самі знікнуць. На жаль, не. Памятаю, мяне турбавала, што мой каханы не захоча са мною больш сустракацца. Дурныя думкі, але... На наступны год мяне чакала яшчэ адна навіна: зноў знайшлі дзве пухліны ў грудзях. Я рабіла аперацыю ўжо ў іншай бальніцы, і ў ёй, на шчасце, наклалі касметычныя швы. Нягледзячы на гэта, усё роўна неяк няёмка (але ўжо не перад каханым, бо разам перажылі непрыемнасць), калі наведваеш працэдуры ў СПА-салонах. Памятаю, неяк запісалася на масаж і не змагла расслабіцца, бо было сорамна і крыўдна. Няёмка перад супрацоўніцай салона. Наўрад ці зараз гэтым кагосьці здзівіш, але яно крыху закранае тваю ўпэўненасць.

Ці хочацца мне зрабіць тату? Змагла б, мабыць, калі б шрамы дасягалі вялікіх памераў. Са сваімі я проста вучуся жыць, успрымаць сябе такой, якая я ёсць. Яны — усяго толькі маленькая частка мяне.

**Ларыса:**

— Пасля ускладненага апендыцыту ў мяне застаўся вельмі непрыгожы шнар. Я не магла апранаць адкрытыя купальнікі, спакойна хадзіць у басейн. Але вось ужо больш за дзесяць гадоў на месцы аперацыі мастацкі твор Алы, і я не адчуваю сябе непаўнавартаснай.

■ У вас будзе дзіця

# МАЛЕНЬКАЕ СОНЕЙКА



**«Звязда» працягвае знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з хлопчыкамі і дзяўчаткамі, якія больш за ўсё на свеце мараць пра дружную сям'ю... Дзякуючы тэлевізійнай рубрыцы «У вас будзе дзіця» (што выходзіць на канале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома») 68 герояў ужо знайшлі клапатлівых бацькоў. Сёння мы раскажам пра абаяльнага Стасіка, які выхоўваецца ў Ждановіцкім дзіцячым доме.**

Хлопчык, якога вы бачыце на здымку, — галоўны артыст і любімец выхавальнікаў. У дзіцячым доме яго пяшчотна называюць маленькім сонейкам, бо Стасік заўсёды ўсміхаецца.

— Стасу толькі 5 гадзікаў. Але, нягледзячы на ўзрост, ён вельмі працалюбівы. Любіць дзяжурыць па сталовай, умее прыгожа накрываць на стол, — расказвае **настаўнік-дэфектолаг Юлія САЎКО.** — Радуе і непадробная цікавасць хлопчыка да музыкі, танцаў. Усім запомнілася, як цудоўна Стасік сыграў ролю грыбочка на адным з нашых свят. Вучыў іншых дзетак, што мухаморы рваць нельга. Як і ўсе хлопчыкі, Стасік вельмі любіць гуляць з машынкамі. Ён будуе для іх гаражы з кубікаў. Яшчэ з тых самых кубікаў ён узводзіць вялікія вежы і дамы. Калі пытаемся «для каго», адказвае: «Для мамы, таты і маленькага сабачкі».

Шчыра спадзяёмся, што вельмі хутка мара Стасіка стане рэальнасцю. Што ў яго будзе сапраўдны дом, дзе будуць жыць мама, тата і ён. І нават, магчыма, маленькі сабачка. І ў гэтым доме будзе цёпла і ўтульна. Але самае галоўнае, маленькае сонейка там будуць шчыра любіць.

***Калі вы хочаце даведацца пра Стаса больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта***

# ЭФЕКТ МАТЫЛЬКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Мужчына, які носіць матылёк, не толькі эфектна выглядае, але і без сумнення пройдзе любы дрэс-код, — кажа Вераніка. — Нават на прыём у каралевы. Без жартаў. У Англіі выкарыстоўваецца так званы дрэс-код «White tie», дзе мужчыну неабходна надзяваць фрак з белым матыльком, каб удастоіцца прыёму ў каралевы Вялікабрытаніі. У Беларусі ж, лічу, неблагой альтэрнатывай можа быць матылёк з арнаментам *(усміхаецца)*. Праўда, асабіста мне хацелася б, каб у нас людзі насілі іх не толькі на святы, а штодзень. Праўда, адразу папярэджваю, трэба быць гатовым да павышанай увагі з боку навакольных. У нас у офісах прынята хадзіць у гальштуках, а вось матылёк — гэта ўжо экзотыка.

Упершыню я ўбачыла Вераніку Машарскую на Дні вышыванкі ў Мінску. Як высветлілася, пачынала дзяўчына са звычайных гальштукаў-матылькоў.

— Падчас вучобы ва ўніверсітэце я захаплялася дызайнам і пашывам жаночай бялізны. Неяк брат прапанаваў пашыць гальштукі-матылькі, маўляў, мужчыны ж таксама хочуць быць моднымі. Потым Ян, а ён у нас цікавіцца беларускай культурай і гісторыяй, падкінуў новую ідэю: «А давай паспрабуем рабіць матылькі з арнаментам». Мне ідэя спадабалася. А мама падказала: «Раней арнамент насіў не столькі эстэтычную функцыю, колькі абарончую. Вышыўка рабілася ў тым ліку і на каўняры. Таму матылёк на шыі можа быць не толькі прыгожым аксесуарам, але і своеасаблівым абярэгам».

Так, дзякуючы сваім блізкім, Вераніка пачала больш глыбока вывучаць беларускі арнамент.

— Сёння мне не цікава выкарыстоўваць асобныя сімвалы, якія вы бачыце на тых самых магнітах: «багацце», «шчасце», «сям'я». Я бяру, як правіла, самадастатковы элемент вялікай вышыўкі, капірую ўзоры з бабуліных ручнікоў, дываноў, выявы якіх знаходжу ў кнігах... Вышываю пры дапамозе швейнай машынкі, аднак у астатнім увесь працэс вырабу матылька — ручная праца.

Што цікава, Вераніка працягвае рабіць розныя матылькі, але менавіта экзэмпляры з арнаментам карыстаюцца найбольшай папулярнасцю.

— Усе прызвычаіліся, што арнамент цудоўна глядзіцца на льняной тканіне. Але я паста-янна эксперыментую: спалучаю розныя колеры, фактуры і віды тканін. Нядаўна паспрабавала вышыць беларускія ўзоры на бархаце, джынсе. І ведаеце — гэта неймаверна прыгожа.

*— Мне вельмі падабаецца, калі жанчына надзявае сукенку, а ў яе кавалера — матылёк і нагрудная хусцінка для пінжака з такога ж матэрыялу.*

— Мне таксама. Гэта мала таго, што глядзіцца крэатыўна, але і на мерапрыемстве адразу відаць, што яны пара. Гэтай ідэяй вельмі актыўна карыстаюцца маладыя на вяселлях. Аднойчы да мяне звярнуўся малады чалавек і папрасіў пашыць ільняны матылёк з ружовым арнаментам. Я здзівілася, пытаюся ў яго: «А вы дзяўчыне сваёй?» — «Не, сабе. У нас вяселле будзе ў ружовым колеры. Мая будучая жонка так захацела». Вось гэта каханне, я разумею! *(усміхаецца)*. А яшчэ адна пара прынесла бабулін ручнік з арнаментам і папрасіла зрабіць па яго матывах матылёк для жаніха і пояс для нявесты.

Што цікава, гальштук-матылёк — мужчынскі аксесуар, але матылькі сям'і Машарскіх карыстаюцца папулярнасцю і сярод дзяўчат. Прычым яны іх надзяваюць не толькі пад класічную блузку. (Важна, каб яна была з каўнерыкам. Бо калі яго няма ці занадта кароткі, то матылёк будзе глядзецца не вельмі прыгожа.) Некаторыя прымацоўваюць матылёк замест пояса, хтосьці на валасы замест абруча.

— Апошнім часам матылькі з арнаментам часта бачу на хлопчыках, якія ідуць у першы клас. Класічная чырвона-белая і чырвона-бела-чорная вышыўка ідэальна спалучаецца з белай кашуляй. А калі арнамент на матыльку, напрыклад, сіні, то я параіла б аддаць перавагу блакітнай. Летась бачыла ў інтэрнэце навіну, што студэнты Брэсцкага каледжа сувязі надзелі матылькі з беларускім арнаментам на дзень прысвячэння ў першакурснікі. Прыемна, што з кожным годам быць беларусам становіцца больш модна.

Тым, хто выбірае матылёк у падарунак, Вераніка раіць не купляць яго проста таму, што спадабаўся малюнак.

— Спачатку зазірніце ў шафу да мужчыны, каб падабраць аксесуар у тон яго адзення. Калі гэта першы матылёк у яго гардэробе, то лепш, каб ён пасаваў пад некалькі кашуль і касцюмаў.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *nadzieja@zviazda.by*



Вераніка МАШАРСКАЯ: «Асабіста мне хацелася б, каб мужчыны насілі матылькі не толькі па святах».



Драўляныя гальштукі-матылькі цяпер у модзе.

## ПАПЯРЭДНЕ ЗАВЯЗАНЫ МАТЫЛЁК

Да недахопаў папярэдне завязанага гальштука-матылька можна аднесці занадта ідэальны вузел і суадносіны бакоў. Аднак, калі няма мэты праславіцца як знаўца моды, гэты варыянт заўсёды падыдзе для пачаткоўца.

## МАТЫЛЁК-САМАВЯЗ

Класічны тып гальштука-матылька ўяўляе сабой простую стужку тканіны з невялікім патаўшчэннем па краях, якую вам неабходна завязваць самастойна. На захадзе яе яшчэ называюць «freestyle», г.зн. «вольны стыль». Як правіла, матылёк, завязаны ўласнаручна, валодае найбольшым шармам і індывідуальнасцю. Акрамя таго, па заканчэнні вечара джэнтльмены часам развязваюць яго і проста вешаюць на шыю. Так робіць у кіно, напрыклад, акцёр Джордж Клуні або Пірс Броснан.

### Вучымся завязваць самастойна






Апошнім часам бацькі ўсё часцей набываюць сваім дзецям матылькі з арнаментам.

## 5 ТЫПАЎ ГАЛЬШТУКАЎ-МАТЫЛЬКОЎ

### Матылёк (The Butterfly)



Класічны варыянт. Па форме нагадвае крылы матылька. У сярэднім шырыня банта складае 5,5—6,5 сантыметраў. І падыходзіць большасці мужчын.

### Вялікі матылёк (The Big Butterfly)



Памер вялікага гальштука-матылька прыкладна 8—8,5 сантыметраў. Таму ён падыдзе мужчыну з буйной шыяй і галавой.

### Кажан (The Batwing)



Гальштук-матылёк у форме кажана — самы вузкі з усіх тыпаў. Ён менш фармальны ў параўнанні з «The Butterfly», але ён таксама падыходзіць пад дрэс-код «Black tie».

Гэта любімы матылёк быцця прэзідэнта ЗША Аўраама Лінкальна, а таксама Джэймса Бонда з фільма пра агента 007.

### Форма брыльянта (The Diamond Point)



Гальштук, што па форме нагадвае брыльянт, — гэта ўдалае спалучэнне класічнай формы і вуглаватых канцоў, падобных да ромба. Матылёк — асіметрычны, таму, калі яго завязваюць самастойна, заўсёды набывае сваю індывідуальнасць у кожнага мужчыны.

### Клубны круглявы (The Rounded Club)



Ужо з назвы вынікае, што краі матылька прымаюць круглявую форму. Такі гальштук падыдзе на вечарынку ў клуб або пад напаўафіцыйны стыль.

**Выбар форм гальштука-матылька, паводле слоў дызайнера, больш залежыць ад вашага густу і жадання, чым ад строгіх правілаў і дрэс-коду. «Выберыце форму, якая больш за ўсё падабаецца вам, і навучыцеся правільна яе завязваць. Гэта і будзе найлепшым выбарам, які створыць вам індывідуальнасць».**

**«У ідэале матылькоў, як і звычайных гальштукаў, павінна быць некалькі, — лічыць Вераніка. — Кожны для сваёй нагоды».**

## МАТЫЛЁК І ФАРМАЛЬНЫ ДРЭС-КОД

Адзін з самых распаўсюджаных выпадкаў, калі можна сустрэць мужчын у гальштуку-матыльку, — афіцыйнае мерапрыемства. Найбольш вядомы дрэс-код — так званы «Black tie»: чорны смокінг, белая кашуля і чорны гальштук-матылёк. У дадатак неабходна надзець камізэльку або спецыяльны пояс «камербанд».

«White tie» — гэта найбольш фармальны і строгі дрэс-код. Каб яму адпавядаць, вам спатрэбіцца: белы матылёк-самавяз (толькі такі тып, ніякіх зашпілек), чорны фрак і белая кашуля. Гэта не вельмі распаўсюджаны дрэс-код, але ён існуе і пра яго неабходна ведаць.

## НАПАЎАФІЦЫЙНЫ ДРЭС-КОД І МАТЫЛЁК

У напаўафіцыйным дрэс-кодзе няма такіх строгіх правілаў, як у фармальным, таму ёсць месца для эксперыментаў. Напрыклад, можна падабраць пад дзелавы касцюм гальштук-матылёк у гарошак.

## ШТОДЗЁННАЕ АДЗЕННЕ І МАТЫЛЁК

Для паўсядзённага стылю няма рамак і правілаў. Хочаце надзець гальштук у клетку з яркай кашуляй і кардыганам? Або матылёк з турэцкімі агуркамі пад ільняны касцюм? Няма праблем! Можна падтрымаць выбраны стыль рознымі аксесуарамі, такімі як падцяжкі, каляровыя шкарпэткі, яркія шнуркі. А вы калі-небудзь бачылі гальштукі-матылькі з дрэва? Цяпер яны, дарэчы, на піку папулярнасці сярод стыльнай моладзі.

# ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 14 марта 2017 года торгов
по продаже имущества, **принадлежащего**

## ОАО «Озерицкий-Агро»

Сведения о продаваемом имуществе:

| Номер предмета торгов | Информация об имуществе | Площадь, кв. м | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 614/С-13696, расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н., Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода. Строение расположено на земельном участке с кадастровым №624800000001000119 площадью 270,4855 га; назначение участка – земельный участок для ведения товарного сельского хозяйства | 2320,2 м$^2$ | 711 601,56 | 71 160 |

**Продавец имущества:** открытое акционерное общество «Озерицкий-Агро», 222215, Смолевичский р-н., аг.Слобода, ул.Центральная, 7.
**Организатор торгов:** консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, к.1703.
Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № 3012201310011 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код 153001964, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 14 марта 2017 года в 12.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 10.02.2017 по 10.03.2017 включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.
Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.torgi.agroconsult.by, e-mail: torgi@agroconsult.by.
Телефоны для справок: открытое акционерное общество «Озерицкий-Агро» – главный юрисконсульт – Козлов И. Л., тел. +375 (1776) 446-17. Организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399-66-39, GSM VEL 8 (029) 816-64-46, GSM MTS 8 (044) 540-64-46

# ОБЪЯВЛЕНИЕ

о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот 1: капитальное строение с инв. №220/С-6022, площадью 1 659,7 кв. м, стоимостью 99 600 рублей;<br>Лот 2: капитальное строение с инв. №220/С-24084, площадью 358,7 кв. м, стоимостью 55 600 рублей;<br>Лот 3: капитальное строение с инв. №220/С-16180, площадью 215,4 кв. м, стоимостью 45 600 рублей;<br>Лот 4: капитальное строение с инв. №220С/15818, площадью 312,4 кв. м, стоимостью 53 400 рублей;<br>Лот 5: капитальное строение с инв. №220С/5773, площадью 529,4 кв. м, стоимостью 32 500 рублей;<br>Лот 6: капитальное строение с инв. №220/С-24085, площадью 368,8 кв. м, стоимостью 70 700 рублей;<br>Лот 7: капитальное строение с инв. №220/С-12823, площадью 745,3 кв. м, стоимостью 46 500 рублей |
| Собственник (владелец) имущества | Глубокское райпо (УНН 300019805) |
| Наличие обременений | Нет |
| Местонахождение (адрес) имущества | Лот 1 – г. Глубокое, ул. Железнодорожная, 22;<br>Лот 2 – г. Глубокое, ул. Юбилейная, 2Б;<br>Лот 3 – г. Глубокое, ул. Советская, 206;<br>Лот 4 – г. Глубокое, ул. Калинина, 48;<br>Лот 5 – г. Глубокое, ул. Железнодорожная, д. 1;<br>Лот 6 – г. Глубокое, ул. Мира, д. 1;<br>Лот 7 – г. Глубокое, ул. Ленина, 131а |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 03.03.2017 в 9.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома.<br>210015, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.3.<br>Судебный исполнитель – Ланцунцевич Сергей Александрович, тел.: (0212) 61 40 06, (033) 6879142.<br>Начальник отдела – Бураков Игорь Вячеславович, тел.: (0212) 61 40 15, (033) 6878807 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 02.03.2017<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

# ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 27 февраля 2017 года
повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего

## ОАО «Электромодуль»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | «Автозаправка с площадкой» общей площадью 5221,5 кв. м, инв. номер 630/С-67164, расположенная по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143 Н (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) с составными частями и принадлежностями | 39 800,00 | 3 900,00 |
| 2 | «Склад готовой продукции» общей площадью 807,1 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-73745, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143/6 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 15 680,00 | 1 500,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
— Увесь час сустракаеш людзей, якія па-рознаму адкрываюць табе свет. Напрыклад, на Камчатцы я быў у гасцях у вулканолага, глядзелі на вывяржэнне вулкана Ключаўская сопка (з лавай і вулканічнымі бомбамі, а попел дасягаў 6 кіламетраў). Прырода, вядома, там дзіўная. Мядзведзь забраў у нас ежу ў першую ж раніцу, на вачах зняў з дрэва пакет з прадуктамі, добра, паспелі з'есці катлеты, якія паклала мне мама з сабой яшчэ ў Беларусі. Наогул часта даводзіцца сустракацца з жывёламі. Калі ехаў на чэмпіянат свету па футболе ў Паўднёвую Афрыку праз Сірыю, Іарданію, Егіпет, Судан, Эфіопію, Кенію, Танзанію, у Мазамбіку ўзніклі праблемы з легалізацыяй, блытаніна з дакументамі. Затрымаўся там на пару дзён. Вярнуўся ў Танзанію, каб атрымаць мазамбікскую візу, а падчас таго, як пераплываў з мясцовымі жыхарамі раку Равума на драўляным каноэ, каля нас з маленькага астраўка ў ваду скокнуў велізарны кракадзіл. У Кеніі бачыў сланоў (пераходзілі перада мной дарогу), у Намібіі — жырафу, барадавачніка. У Канадзе і на Алясцы шмат мядзведзяў, ласёў, на поўдні Паўднёвай Афрыкі — пінгвінаў (яны выходзілі аж да асфальтавай дарогі каля акіяна), а ў Аўстраліі на полі каля нашага дома часам раніцай «тусаваліся» кенгуру.

### «Даводзілася спаць у пякарні, музеі, рэстаране...»

*І ўсё ж Аляксей сцвярджае, што падарожнічаць сярод людзей, хоць і з сустрэчамі дзікіх жывёл, бяспечна, але ўспамінае некаторыя трывожныя моманты.*

— Бяспека залежыць ад нашых паводзінаў, таму, перш за ўсё, ты сам павінен добразычліва ставіцца да людзей. Вядома, за гэтыя гады здараліся розныя моманты. У Македоніі, напрыклад, кіроўца наўмысна звёз мой заплечнік. А заплечнік для вандроўніка — гэта хата, там і спальнік, і палатка, і сродкі гігіены.

Або гісторыя ў Мазамбіку. Ноччу чалавек у цывільным запатрабаваў мае дакументы, я паказваць іх адмовіўся, потым аказалася, што гэта бос паліцыі. Мяне забралі ва ўчастак, там я правёў ноч, але гэта было нават забаўна — паглядзець як уладкаваныя камеры ў паліцыі Мазамбіка. На пішучай машынцы там запісвалі мае паказанні. XXI стагоддзе... Было цікава.

*Нетыповыя месцы выбірае сабе хлопец і для начлегу.*

— На Камчатцы папрасіўся ў пякарню, хоць меў на той момант запрашэнне ў госці на начоўку ад людзей з трох розных дамоў. У чалавека, які працаваў там, быў тэлевізар, якраз у гэты час трансліравалі Алімпіяду ў Бразіліі, вельмі хацелася паглядзець. У выніку, акрамя спаборніцтваў, яшчэ і хлеба напяклі. А наогул даводзілася спаць і ў музеі, рэстаране, аптэцы, ну і на вілах мільянераў, дарэчы, таксама.

### «Ім не хапае грошай на ежу, яны збіраюць іх на футбол»

*Спартыўным аб'ектам, які больш за ўсё ўразіў Аляксея, ён называе Стары і Новы Уэмблі.*

— Быў там на фінале ў канцы 90-х, а затым на футбольным матчы Англія—Беларусь у 2009 годзе. Яшчэ вельмі спадабаўся стадыён у Лілі, дзе гулялі нашы гандбалісты сёлета. На матчы Швецыя—Беларусь было 16 тысяч гледачоў, рэкорд для нашай зборнай. На чвэрцьфінале (Францыя—Швецыя) стадыён быў практычна поўны — каля 26 тысяч гледачоў. Гэта было неверагодна, як яны спявалі Марсельезу, як падтрымлівалі сваю зборную.

Алімпійскія гульні ў Лондане таксама ўразілі: шмат людзей, турыстаў. На гандбольным матчы побач сядзелі людзі, якія не ведалі, хто такі Нікола Карабаціч, Цьеры Амейе, напэўна, першы раз былі на гандболе. Таму і атмасфера ўжо іншая. Часткова з гэтым я сутыкаўся і на чэмпіянаце свету па футболе ў Бразіліі. Матчы наведвалі багацеі, людзі бізнесу або артысты, звычайныя балельшчыкі не маглі сабе гэтага дазволіць. Пасля чэмпіянату я яшчэ застаўся ў краіне і паехаў на матч «Фламенга», там ужо ўбачыў звычайных бразільцаў, якія хварэюць з песнямі, сцягамі, крыкамі. Гэта зусім іншае.



Аўтастоп — ён і ў Афрыцы аўтастоп.

*Свае планы Аляксей складае прыкладна на 3—5 гадоў наперад. Заўзятара з Беларусі, які часцяком з'яўляецца адзіным прадстаўніком нашай краіны на топ-спаборніцтвах, ужо ведаюць многія замежныя аматары спорту.*

— Мы адрозніваемся ад іншых. Беларусы досыць спакойныя, напэўна, з-за свайго мінулага. Бо ў Савецкім Саюзе актыўна падтрымліваць сваю каманду лічылася заходняй манерай. Вы бачылі, як хварэлі французы за сваіх гандбалістаў на чэмпіянаце? Так умеюць толькі яны і палякі!

Вельмі эмацыянальныя балельшчыкі ў Марока, быў на футбольным матчы ў Касабланцы. Прыйшоў за 4 гадзіны да пачатку, на стадыёне было ўжо каля 25 тысяч гледачоў, на самой гульні — 55 тысяч (поўны стадыён!). Горад жыве футболам, многія балельшчыкі з бедных сем'яў, ім не заўсёды хапае грошай на ежу, але яны ходзяць па горадзе і збіраюць іх на футбол. Гэта традыцыі, шоу, людзі праводзяць на стадыёне па паўдня. На вачах змяняецца культура паводзін на стадыёнах у Еўропе. Тры чвэрці балельшчыкаў сёння паводзяць сябе, як у тэатры, футбол становіцца больш бізнесам, чым культурай, гэта ўжо не тое, што было 10—15 гадоў таму.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by



У афрыканскай саванне ў час засушлівага сезона, калі не хапае травы, козы пасуцца на... дрэвах.

# «Я НЕ СУПРАЦЬ СЛОВА «КАХАННЕ»...

## Ды Радзіму лепей любіць

**З нечага арыгінальнага гэтую размову, відаць, не пачнеш: прыйдзецца (услед за Сіманавым) паўтарыць яго прыгожае:**
**«Письма пишут разные:**
**Слёзные, болезные,**
**Иногда прекрасные,**
**Чаще — бесполезные...»**
**І рэдакцыі тут не выключэнне.**

### Што лічыць памылкай?

*Беларуская мова ў Беларусі,* — піша, у прыватнасці, спадар К., — *не займае пакуль таго месца, якое належыць* (хто б спрачаўся, як той казаў...). *І вінаваты ў гэтым, на мой погляд, так званыя новаўтварэнні.*

*Цяпер у газетах можна прачытаць: «Гулец Іваноў даў пас». Па інтэрнэце таксама спартыўныя рэпартажы ўсё часцей ідуць на роднай мове. Там футбольныя вароты часам называюцца брамамі, вуглавы ўдар — кутавым, а бакавая лінія — стужкай. Думаю, каментатарам не пашкодзіла б спачатку зазірнуць у слоўнікі...*

Слушная парада, прычым не толькі для каментатараў. У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (возьмем пад рэдакцыяй Кандрата Крапівы) ёсць і слова «іграць» (на музычных інструментах, на сцэнах, на нервах, біржах) і «гуляць»: забаўляцца, прагульвацца, быць свабодным ад работы, весяліцца, любіцца... У гэтым шэрагу — і «праводзіць час за якім-небудзь заняткам з мэтай адпачынку, забавы». Прыклады — гуляць у жмуркі, у шахматы, у карты. Да месца тут і «футбол», бо беларусы ў яго хутчэй гулялі і гуляюць, а не іграюць. Значыць, слова «гулец» апраўдана. Апроч таго, яно засведчана ў апошніх акадэмічных слоўніках, у «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы», у перакладным «Русско-белорусском словаре» (цытата: «Игрок — гулец»)... Як — заўважце — «касец» ад слова «касіць», «прадавец» ад «прадаваць», «плывец» ад «плыць», «курэц» ад «курыць»...

«Гулец» гучыць непрывычна?

Згодны. І нават ведаем, чаму. Беларуская мова (цытуючы спадара К.) не займае пакуль таго месца, якое належыць, а жывучы ў рускамоўным асяроддзі, людзі Беларусі болей чуюць слова «игрок», «играть» і менавіта іх (як і безліч іншых) успрымаюць хутчэй.

Тады (працягваючы тэму футбола) «вароты» ці «брама», «лінія» ці «стужка»? Тут і ў слоўнік можна не глядзець... Хіба для таго, каб пераканацца: ну вядома ж, «вароты» і, вядома ж, «лінія».

Не выключаюць сумненняў і словы «вугал» ці «кут». Ва ўсякім разе ў тых, хто ведае, што абразы спрадвеку віселі ў куце, што менавіта туды строгія бацькі ставілі дзяцей, якія ў нечым правініліся.

Месца, з якога наносіцца ўдар, таксама знаходзіцца ў межах поля, у куце. Таму па-беларуску і ўдар больш лагічна называць «кутковым» альбо «кутнім».

Гэта непрывычна гучыць? А калі было прывыкаць, калі трансляцыі па-беларуску і сапраўды амаль не вяліся і, толькі пачынаючы гэта рабіць, рускае слова «угловой» менавіта перакладаецца, паводле слоўніка, як «вуглавы», хоць у нашай мове паміж ім, вуглом, і яго (скажам так) унутранай часткай — кутам — розніца ёсць.

Пра яго тут дарэчы прымаўка: «Добраму чалавечку добра і ў запечку, а як свалаце, дык дрэнна і на куце». Гэта значыць, на покуці, пад абразамі, на самым ганаровым месцы, на самым прыгожым.

У беларускай мове ёсць (як правільна заўважае спадар К.) і слова «красны». *«Мне ўспамінаецца,* — піша ён, — *цудоўная беларуская песня: «Каліна красная да долу сцелецца...» І слова «красная» тут дарэчы.* (Стоп: але ці можа каліна — слацца? Інтэрнэт падказвае, што ёсць песня са словамі — адчуйце розніцу! — «Каліна красная марозам спеліцца...»). *Супраць слова «каханне» я таксама нічога не маю (Дзякуй!), хоць ёсць і «любоў».* (І сапраўды, кахаць — значыць, мець вялікае пачуццё да асобы іншага полу, а пра маці, мову, Радзіму лепей казаць «люблю»). *Але ж у мяне,* — чытаем далей, — *іншы раз складваецца ўражанне, што мы адрываемся ад народа. Нядаўна па радыё я пачуў словазлучэнне: «Прышчэпкі ад грыпу». Да яблыні — разумею, ад грыпу трэба казаць «прывіўка». Можна спрачацца і аб тым, якое слова гучыць лепш «шаша» ці «шасэ», «ладонь» ці «далонь»? У беларускіх слоў «зала і фасоля» канчаткі таксама нейкія штучныя... Ва ўсякім разе, думаю, не трэба лічыць памылкай, калі чалавек піша ці вымаўляе так, як лічыць неабходным, асабліва, калі гэтыя словы не рэжуць слых, гучаць мякка.*

Ну, што тут сказаць апроч таго, што, раячы некаму зазіраць у слоўнікі, аўтар не глядзеў туды сам. Бо інакш убачыў бы, што словы «зал» і «фасоль» (без «штучных» канчаткаў — рускія (пры жаданні можна даведацца, якое адкуль прыйшло), «прывіўка» — таксама. А вось «прышчэпка» — наша, і прышчапіць, апроч іншага, значыць, «увесці ў арганізм вакцыну, каб папярэдзіць або вылечыць якую-небудзь хваробу».

Ужыванне рускіх слоў у беларускай мове не трэба лічыць памылкай? А як тады настаўнікам ды выкладчыкам ацэньваць веды вучняў, абітурыентаў і студэнтаў, як выдаваць газеты і кніжкі — на трасянцы?

І ўжо зусім вар'яцкае пытанне: куды дзець тытанічную, карпатлівую, самаахвярную працу — справу жыцця нашых папярэднікаў: класікаў літаратуры, мовазнаўцаў, аўтараў падручнікаў і шматлікіх слоўнікаў? Свят-свят-свят, адрынуць, як нешта непатрэбнае?

### ...Нам засталася спадчына

*«Рэжа вушы,* — працягвае аўтар ліста, — *і слова «напой». Мне думаецца, што яго можна ўжываць толькі тады, калі размова ідзе пра жывёлу, а мы, людзі, п'ём «напіткі». І навошта нам выраз «так бы мовіць», калі ёсць «можна сказаць», навошта — «мае рацыю», калі ёсць слова «згодзен»... А хіба гучыць слова «маўляў»?*

Вось тут спадар К. і сапраўды мае рацыю: «маўляў» не гучыць (дакладней — гучыць вельмі рэдка), як і безліч іншых беларускіх слоў у нашых штодзённых размовах, на вуліцах, у крамах, па радыё ды тэлебачанні. І з гэтай прычыны рэжа некаму вушы...

А калі разабрацца, калі сапраўды любіць сваю краіну і мову, то ў чым немілагучнасць? Словы як словы: наша, беларускае, даўно вядомае, як, дарэчы, і слова «напой», зафіксаванае больш як сто гадоў таму ў слоўніку Івана Насовіча, як выразы «так бы мовіць» і «мае рацыю».

Але ж чытаем далей. *«У сваёй вёсцы, ідучы за пакупкай* (у беларускай мове ходзяць па некага ці па нешта, а за — хіба ўслед), *мы гаварылі, як каму ўздумаецца. Адзін казаў, што ідзе ў краму, другі — у лаўку, трэці — у магазін. Гэтыя словы і сёння ўспрымаюцца большасцю жыхароў Беларусі.*

Усміхніцеся: выраз «можна сказаць» спадар К. прапануе пакінуць, а «так бы мовіць» — «выкінуць». А чаму б тады і гэты «рад» не прапалоць? Чаму б не пакінуць адно слова? І не змяніць шыльды?..

Усялякае параўнанне кульгае. Гэтае, магчыма, на абедзве нагі. Але ў кожнай сям'і (асобная сям'я — асобная дзяржава) ёсць нейкія набыткі, ёсць грошы. Не будзем разважаць на тэму, колькі, адкуль і дзе яны ляжаць. Уявім сабе: нехта прызнаў, што пяцірублёўкі, напрыклад, «рэжуць вока», што іх трэба... канфіскаваць.

Не вазьмуся ўявіць, а тым больш апісаць, што канкрэтна той чалавек пачуе ў свой адрас і дзе апынецца, бо гэта ж грошы!

А мова, атрымліваецца, не набытак, не скарб, які нам давалі ў спадчыну?

Але ж мы ці прынялі яго, бо часам такое ўражанне, што ён, нібы тая дзедава хата — недзе стаіць ды ціха развальваецца.

І вось тут што здзіўляе: варта некаму ўзяцца за рыштунак, за шыфер і дошкі, за пэндзаль, каб паправіць, прыбіць, пафарбаваць — адразу ж з'яўляецца «група дарадцаў» з іх заўсёдным «не тое робіш», «не так», «не ўмееш — не бярыся» і наогул: «Злазь з даху, не псуй гонту»... Альбо — калі да тэмы — «няправільна», «у нашай вёсцы так не казалі...», «паглядзі ў слоўнік», «спачатку навучыся размаўляць, авалодай мовай»...

Спадару К., трэба разумець, зрабіць гэта было зусім няцяжка, бо вырас ён у вёсцы, хадзіў там і «ў краму», і «ў лаўку», і «ў магазін», то-бок засвойваў мову без ніякага напружання — з малаком маці.

Сённяшнім маладым, вывучаючы беларускую мову амаль як замежную, кожнае слоўца трэба засвоіць, зразумець, зафіксаваць у памяці... А яшчэ горш — адолець неразуменне, а то і сапраўдную крытыку, бо менавіта ёй — крытыкай — будзе сустракацца ці не кожная спроба па-беларуску размаўляць, нешта пісаць, весці рэпартажы, ствараць рэкламу ды іншае.

### Мы не таварышы. І не спадары?

*«Каб наша мова ўспрымалася і гучала,* — чытаем у лісце, — *не трэба засмечваць яе няўдалымі словамі-калекамі. У праграме тэлеперадач бачу «Гонка пераследу». Калі хочаце, каб нашы словы адрозніваліся ад рускіх, напішыце «гонка наўздагонкі»* (так у аўтара) *ці «наўздагон па следу».*


Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

*Слова «спадар» таксама штучнае. У дачыненні да чалавека фізічнай працы, можа, яно і гучыць. Але нават у гэтым выпадку я скажу: «Іван Іванавіч сапраўдны гаспадар. У яго і ў доме, і ў гародзе парадак».*

Крыўдна, што даросламу і, трэба разумець, адукаванаму (у мове) чалавеку сёння трэба тлумачыць, што словы «спадар» і «гаспадар» — розныя, што яны ў нашай першай з дзвюх дзяржаўных моў фіксуюцца з XVI стагоддзя (прынамсі, у тады напісанай Баркулабаўскай хроніцы можна прачытаць, як у галодную вясну па хатах хадзілі жабракі і як прасілі (пачуйце — найперш самі словы...): «Матухно, зезулюхно, утухно, панюшко, сподарыня, солнце, месяц, звездухно, дай крошку хлеба!»

Дык ці трэба тады дзівіцца, што ў свой час на змену савецкім «таварышам» прыйшлі словы «спадар», «спадарыня», «спадарства», што менавіта яны сталі выкарыстоўвацца ў якасці зваротаў. Наша газета пра гэты «працэс» пісала. Артыкул так і называўся тады «Спадарыня, дазвольце ёй застацца!». На сайце альбо ў падшыўках той нумар («Звязда» ад 8 красавіка 2009 года) можна знайсці, як і водгукі, якія друкаваліся потым, і, спадзяёмся, паспрыялі таму, што слова гучыць.

Кажаце, што пакуль няcмела?

І сапраўды, бо адна-дзве газеты мала што зменяць, адзін-два вялікія канцэрты з беларускамоўным вядучым таксама. Трэба, каб да «працэсу» далучаліся іншыя СМІ, а яшчэ лепш, каб міністэрствы... гандлю і транспарту.

Прычым тут яны? А ўявіце, што заўтра ва ўсіх цягніках, аўтобусах, тралейбусах, трамваях, метро замест (дзякуй Богу, беларускага), але ж нейтральнага «Уважаемые пассажиры» (у крамах «Уважаемые покупатели») па гучнай сувязі загучыць «Шаноўнае спадарства!».

Чым яно лепш?

Тым, што гэта (загінайце пальцы) сапраўды па-нашаму, па-беларуску; тым, што стымулюе самапавагу — не толькі ў пасажыраў, але і ў транспартнікаў (бо «шаноўныя» — гэта не проста паважаныя, а вельмі паважаныя), тым што гэта, так бы мовіць, ператварае пэўную частку насельніцтва ў людзей, у асоб — у тых жа «мадам» і «месье», «сеньёраў» і «сеньярыт», у «паноў» і «паненак», у «дам» і «господ» ці «сударей» і «сударынь»...

А ўрэшце тым, што гучыць гэта куды прыгажэй, карацей і цікавей — у тым ліку для гасцей краіны, якія хіба тут, у Беларусі, могуць пабыць спадарствам...

### Да людзей... Па параду...

Зрэшты, *да новаўвядзенняў і надання новага подыху архаізмам трэба ставіцца вельмі ўважліва,* — піша аўтар. — *Нельга спасылацца (?!) толькі на сваю інтуіцыю, як гэта іншы раз робіць тэлеканал «Беларусь 3», «выкалупваючы» словы накшталт «шэрхнуць», «рына» і інш.*

Першае слова, паводле слоўніка, — станавіцца цвёрдым, падсыхаць (пра глебу, напрыклад), другое — сінонім да «вадасцёка». Дык чаму іх нельга ўжываць?

*З гэтай нагоды ўспамінаю, што адзін вядомы кампазітар з новай песняй прыходзіў у дзіцячы сад і назіраў, як дзеці ўспрымалі яго твор: радаваліся і плёскалі* (так у аўтара) *у далоні — даваў яму зялёную вуліцу, а калі калупалі ў носе — кідаў у кошык* (трэба разумець, у смеітніцу?). *Дык вось,* — робіць высновы аўтар, — *узбагачаць мову за кошт некім прыдуманага сіноніма, можа, і трэба, калі ў гэтым ёсць вострая неабходнасць, калі слова ўспрымаюць людзі рознага ўзросту і адукацыі. Я не гавару ўжо пра тое, што перш, чым* выдаваць новыя перакладніцкія (так у лісце) і тлумачальныя слоўнікі, наведайце, паважаныя навукоўцы, працоўныя калектывы.

Ісці ў дзіцячыя садкі з новымі дзіцячымі песнямі, магчыма, і варта. Слухаць жывую беларускую мову ад непасрэдных носьбітаў — і пагатоў, але ж...

Розных — у тым ліку самых, скажам так, нечаканых — ініцыятыў нашы людзі зазналі шмат. Але ж каб сёння пайсці — умоўна — да рабочых трактарнага завода ці СВК «Старынкі» і спытацца, ці не трэба нам уключыць у слоўнік «гонку наўздагонкі» і ці не «выключыць» адтуль «маўляў»...

Усміхніцеся. І ўявіце, што правялі такі «народны рэферэндум» (да гэтай адказнай працы спадар К. гатовы, відаць, прычыніцца?), прыбралі слова «маўляў». А чым яго замянілі? Больш прыгожымі рускімі «мол» і «дескать»? Нечым англійскім, польскім, кітайскім? Зноў трэба пайсці ў працоўныя калектывы, каб параіцца з людзьмі? І зноў пазычыць — яшчэ і слоў?

Кажуць, што Кацярына Фурцава, міністр культуры ў былым Саюзе, лічыла, што прафесійнае мастацтва людзям без патрэбы, што на змену яму абавязкова прыйдзе мастацкая самадзейнасць.

У той час даводзіць іншае было смерці падобна, але ж аднойчы ў яе спыталі: калі б спатрэбілася (прабачце) зрабіць аборт, то да каго яна пайшла б — да прафесійнага гінеколага ці да доктара-аматара?

І сапраўды, лёгкую прастуду, паслухаўшы людзей, можна палячыць малінавым варэннем ці гарэлкай з перцам. Што датычыцца сур'ёзных хвароб, трэба шукаць спецыялістаў.

Праца над слоўнікамі — гэта, кажаце, нешта іншае? Так. Але ж давайце «ўзважым» менш ці ўсё-такі больш важнае, калі ў першым выпадку размова ідзе пра здароўе і лёс асобнага чалавека (пры ўсёй любові да яго!), а ў другім — пра лёс мовы — багатай, прыгожай, мілагучнай, якую мы атрымалі ад папярэднікаў, каб потым перадаць нашчадкам.

Толькі пытанне: якой?

...З нечага арыгінальнага пачаць гэтую размову не атрымалася, а вось завяршыць...

Амаль адначасова з першым лістом спадара К. у рэдакцыю прыйшоў яшчэ адзін, таксама ад настаўніка, Івана Курсевіча (светлай памяці!) з вершам-пытаннем, вершам-роздумам, вершам-заклікам... Чытайце:

*Матчына мова, што ж з табой стала?*
*Дзе ты падзелася, дзе ты прапала?*
*Выйдзеш на вуліцу — чуеш там словы*
*Толькі не з нашай, не з роднае мовы.*
*Песні дзяцінства... Іх вельмі нямала*
*Па-беларуску мне маці спявала.*
*Дзядуля на печы казкі чытаў —*
*Змалку сваё любіць прывучаў.*
*Помняцца й вершы... Купала і Колас...*
*Нам іх чыталі ў школе ўголас...*
*Цёплай і роднай мова здавалася.*
*Дзе ж ты прапала, куды падзявалася?..*
*Што ж мы за людзі, што з намі стала?*
*Скарбы губляем, і клопату мала.*
*Як жа будзіць, каб нарэшце прачнуліся,*
*Тварам да мовы сваёй павярнуліся?*

**Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** *Тым, чые маці і нават бабулі па-беларуску не размаўлялі, застаецца хіба нагадаць пра нашу агульную маці-радзіму, пра Беларусь. Ставіцца да яе, ну вядома ж, можна па-рознаму, па мне — найлепей любіць. Што гэта значыць?*

*Тут дарэчы азначэнне Льва Талстога: «Любоў — гэта дзейнае жаданне дабра...» Можна — асобе іншага полу (чытай каханай), можна — Радзіме, а значыць, мове.*

**P.P.S.** *Прозвішча і зваротны адрас спадара К. не друкуем з этычных меркаванняў*

■ Знешняя палітыка

# «У ВАС ЁСЦЬ ГУСТ ДА ТАКІХ РЭЧАЎ»

## Пасол Аўстрыі — пра тое, што можна палюбіць за год работы ў Беларусі

**Сёлета Беларусь і Аўстрыя адзначаюць чвэрць стагоддзя з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін. Пра тое, што да гэтай даты краіны падышлі на пад'ёме двухбаковых стасункаў, сведчыць адкрыццё пасольства Аўстрыі ў Мінску, якое адбылося якраз год таму. На працягу апошняга года краіны абмяняліся шэрагам палітычных візітаў на высокім узроўні. Аўстрыя застаецца адным з найбуйнейшых інвестараў у эканоміку Беларусі і бярэ актыўны ўдзел у мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў самых розных сфер. Усё гэта стала нагодай для размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Аўстрыйскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандрам БАЙЕРЛЕМ.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Спадар пасол, абазначце, калі ласка, галоўныя вынікі першага года работы пасольства Аўстрыі ў Беларусі.***

— У 2016-м нам сумесна з Аўстрыйскім культурным форумам у Маскве, які ўзначальвае Сімон Мраз, удалося распачаць Аўстрыйскі культурны сезон 2016—2017 года ў Беларусі. Сезон быў падтрыманы на высокім узроўні з фінансавага боку, і яго праграма атрымалася багатай. Трэба сказаць, што ідэя зрабіць вялікі культурны праект у Беларусі нарадзілася ў пасла Аўстрыі ў Маскве доктара Эміля Брыкса адразу, як толькі ён прыехаў у Мінск. Ён доўгі час кіраваў Дэпартаментам культуры і палітыкі Федэральнага міністэрства па еўрапейскіх і міжнародных справах.

Сёлета ў рамках Аўстрыйскага культурнага сезона таксама адбудзецца некалькі буйных мерапрыемстваў. Адно з іх прысвечана 25-годдзю ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Аўстрыяй і Беларуссю — сімпозіум, які пройдзе ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Другім ключавым мерапрыемствам стане сумесная пастаноўка Канцэртнага цэнтра Брукнера (Brucknerhaus) і Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі «Чароўнай флейты» Моцарта.

Мне вельмі прыемна, што ў рамках Аўстрыйскага культурнага сезона прайшлі ўнікальныя канцэрты, у тым ліку вялікі гала-канцэрт у Палацы Рэспублікі і сусветная прэм'ера сучаснага аўстрыйскага кампазітара Габрыеле Прой у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, мастацкія выставы, кінафестываль... Мы пазнаёміліся з новымі партнёрамі, і я ўпэўнены, што ў наступныя гады ў нас будзе яшчэ больш праектаў, бо цяпер, калі людзі ўсё гэта ўбачылі і пачулі, на падобныя мерапрыемствы ўзнікне попыт.

Нарастаючая дынаміка ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі радуе. Не сумняваюся, што гэтаму будзе садзейнічаць і прызначэнне былога намесніка міністра замежных спраў Беларусі Алены Купчынай на пасаду пасла ў Вене. Упэўнены, што гэты цудоўны чалавек і выдатны дыпламат шмат зробіць для нашых двухбаковых адносін. Нам увогуле шанцуе з беларусамі, з якімі мы працуем. Тое, што былы пасол у Аўстрыі Валерый Варанецкі цяпер працуе ў парламенце, таксама на карысць двухбаковым адносінам.

***— Вы зрабілі акцэнт на культурнай сферы, ці не азначае гэта, што дзелавыя стасункі аказаліся не такімі паспяховымі?***

— Ні ў якім разе. Гэта азначае, што бізнес паміж нашымі краінамі развіваецца самастойна, ён не патрабуе высілкаў з боку пасольства. Аўстрыя па-ранейшаму застаецца вядучым заходнім інвестарам Беларусі. Безумоўна, я імкнуся садзейнічаць развіццю дзелавога супрацоўніцтва, разам з тым існуе шэраг гістарычных прычын той спрыяльнай сітуацыі, якая склалася ў гэтай сферы.

Яшчэ ў 80-х гадах у Жлобіне па рашэнні Масквы быў адкрыты сталеліцейны завод, у будаўніцтве якога ўдзельнічала Аўстрыя. Тое, што ў БССР было вырашана размясціць цяжкую прамысловасць, несумненна ўдача. Як і рашэнне прыцягнуць сюды перадавыя заходнія тэхналогіі. На той час у Аўстрыі таксама дзяржава аказвала вялікі ўплыў на індустрыю, існавалі нацыяналізаваныя прадпрыемствы-гіганты, такія, напрыклад, як сталеліцейная кампанія Voestalpine, якая дагэтуль з'яўляецца ключавым партнёрам Беларускага металургічнага завода. Таму Савецкаму Саюзу было лягчэй супрацоўнічаць з Аўстрыяй, чым, скажам, з краінай, дзе ў цяжкой прамысловасці пераважала прыватная ўласнасць.

Акрамя таго, сама назва краіны — Аўстрыя — перакладаецца са старажытнанямецкай як «усходняя дзяржава». Нездарма нам лёгка наладзіць добрыя стасункі з беларусамі і расіянамі: у нас блізкі менталітэт. Напэўна, таму мы плённа супрацоўнічаем і ў дзелавой сферы.

Яшчэ адзін важны момант: у Аўстрыі знайшліся смелыя бізнесмены, якія пажадалі працаваць ва Усходняй Еўропе. Можна прывесці ў прыклад спадара Стэпіча, які аказаў моцны ўплыў на прыцягненне аўстрыйскіх інвестыцый у Беларусь, у тым ліку на адкрыццё Пріорбанка, а таксама спадара Кайндла з фірмы Кронашпан, спадара Капша... Гэтыя людзі сваім прыкладам матывуюць іншых інвестараў прыходзіць на рынак Беларусі. Кіраўнік Гандлёва-прамысловай палаты Аўстрыі доктар Ляйтль, які прыязджаў у Беларусь, таксама расказвае пра прывабныя ўмовы для развіцця бізнесу тут.

Нашы краіны з'яўляюцца добрымі партнёрамі ў бізнесе. Гэта не азначае, што ніякіх праблем няма, бо тыя або іншыя пытанні, безумоўна, могуць узнікаць, але яны не перашкаджаюць нам сумесна працаваць на поспех.

***— Што кажуць аўстрыйскія бізнесмены пра ўмовы работы ў Беларусі?***

— Што датычыцца цяжкасцяў, то яны адзначаюць пэўны савецкі падыход да вядзення спраў. Аднак, дзякуючы таму, што ў Беларусі няма карупцыі, будаваць бізнес тут лягчэй. Трэба сказаць, што аўстрыец, які прывык падпарадкоўвацца законам, будзе адчуваць сябе ў Беларусі камфортна. Яму тут нават будзе лягчэй, чым дома, бо ў Аўстрыі зараз імкнуцца настолькі палегчыць заканадаўчую базу, што ад гэтага ўзнікаюць новыя складанасці.

***— Аўстрыя — краіна нейтральная. У аўстрыйскім грамадстве, пры гэтым, адбываецца дыскусія наконт магчымага членства Аўстрыі ў НАТА. З вашага пункту погляду, усё-ткі існуе кансенсус супраць уваходжання ў Паўночнаатлантычны альянс ці гэта рэальна?***

— Гэта вельмі добрае пытанне. Думаю, што лёгка прасачыць вялікія гістарычныя змены з гэтай нагоды. Адносіны Аўстрыі з Расіяй — гэта доўгая гісторыя адносін дзвюх імперый. Падзеі XX стагоддзя траўміравалі абедзве нацыі: і расійскую, і аўстрыйскую. Але Расія здолела пасля распаду імперыі захаваць велізарную тэрыторыю, а Аўстрыя не: ад 698 тысяч квадратных кіламетраў засталося толькі 83,9 тысячы, была страчана імперская ідэнтычнасць. Насельніцтва было 60 мільёнаў, стала шэсць, гэта была катастрофа.

Потым да ўлады прыйшлі Сталін і Гітлер... Пасля Другой сусветнай вайны нам трэба было вызначыцца, хто мы, кім хочам быць. Мы ганарымся тым, што ў рэшце рэшт у 1955 годзе заключылі пагадненне з містэрам Хрушчовым пра тое, што будзем цалкам прызнанай суверэннай дзяржавай, і нейтралітэт стаў цаной, якую мы за гэта заплацілі. Спачатку гэта разглядалася некаторымі людзьмі як ахвяра, прынесеная СССР, але ў той жа час мы разумелі, чаму Масква хоча нас бачыць нейтральнымі. Цікава, што тое, што спачатку разглядалася як сродак стрымаць нас ад ваеннай інтэграцыі з Захадам, стала часткай нашай ідэнтычнасці. І з часам мы ўсё больш і больш ганарымся гэтым.

Але затым здарыўся чарговы шок у 1989 годзе: югаслаўская драма. Расія тады была зусім іншай краінай, чым цяпер, у 1990-х гадах яна сама перажывала вельмі няпростыя часы і не магла прымаць удзел у югаслаўскіх падзеях на належным узроўні.

Другім шокавым фактарам стала страта бяспекі на Усходзе, паколькі раптам СССР адступіў. Пачаўся крызіс каштоўнасцяў. Пачаўся вельмі жорсткі пераход да брутальнага тыпу капіталізму. Мы не ведалі, як гэта ўспрымаць, як арыентавацца. І ў гэты момант пачалася падтрымка НАТА ў Аўстрыі, таму што людзі сказалі: «Нейтралітэт больш не важны, дэмакратыя цяпер будзе ўсюды, уключаючы Маскву, чаму мы павінны быць нейтральнымі на кантыненце?» І некаторыя людзі сталі лічыць, раз НАТА больш не мае вонкавых ворагаў, яно становіцца больш моцным варыянтам АБСЕ.

Але калі падчас працы адміністрацыі Буша адбыліся ўварванне ў Афганістан, крызіс на Блізкім Усходзе і інш., НАТА стала губляць сваю папулярнасць. У дадзены момант нейтралітэт аказаўся выратавальным выйсцем, і людзі ў Аўстрыі зноў давяраюць гэтай канцэпцыі.

***— Калі казаць пра другі год работы аўстрыйскага пасольства ў Мінску, плануецца яго пераезд, пашырэнне?***

— Планаў і ідэй шмат. У тым ліку і па ўласным будынку пасольства, і па пашырэнні штату. І па прадаўжэнні аўстрыйскіх культурных праектаў на тэрыторыі Беларусі...

***— Для вас асабіста як прайшоў першы год місіі ў нашай краіне?***

— Было так шмат работы, што часу для асабістага жыцця практычна не заставалася. Тым не менш я паспеў зразумець, што Беларусь з'яўляецца вельмі камфортнай краінай для жыцця. У Мінску адбываецца шмат цікавых падзей: канцэртаў, выстаў... На гэтых выхадных я пабываў упершыню ў цырку — проста фантастыка! Тут ёсць выдатныя рэстараны, бары, музеі... У Нацыянальным мастацкім музеі я мог бы правесці некалькі дзён запар.

***— Ці з'явіліся ў вас любімыя беларускія «штучкі» (у шырокім сэнсе гэтага слова)?***

— Нядаўна ўбачыў у нейкай будаўнічай краме драўляныя разныя ліштвы для вокнаў. Думаю, калі б такія рэчы экспартавалі, яны б мелі вялікі попыт за межамі Беларусі, бо яны надзвычай прыгожыя. На жаль, многія заходнія фірмы часта забываюць, што рэчы павінны быць не толькі функцыянальнымі, але і прыгожымі. У Беларусі пра гэта памятаюць. У вас ёсць густ да такіх рэчаў. І гэта трэба абавязкова падтрымліваць. Я ў захапленні ад вышытых беларускіх абрусаў, ручнікоў...

**Пытанні задавалі доктар палітычных навук Сяргей КІЗІМА і Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

## Хроніка апошніх падзей

### Кітай прапанаваў ЗША ўспомніць Другую сусветную вайну

Такім чынам міністр замежных спраў КНР Ван І пракаменціраваў пытанне журналістаў пра тое, ці можа паміж Кітаем і Злучанымі Штатамі паўстаць узброены канфлікт у Паўднёва-Кітайскім моры. «Я ўсяго толькі хачу прапанаваць амерыканскім сябрам асвяжыць у памяці гісторыю Другой сусветнай вайны», — прыводзіць словы міністра Цэнтральнае тэлебачанне Кітая. Як адзначыў кіраўнік ведамства, згодна з Каірскай і Патсдамскай дэкларацыямі, Японія павінна была вярнуць Кітаю ўсе незаконна адчужаныя ад яго тэрыторыі, да якіх у тым ліку адносіцца архіпелаг Наньша (Спратлі).

### У Францыі за ноч затрымалі 23 пратэстоўцы

Французскія паліцэйскія затрымалі 23 чалавекі, якія падазраюцца ва ўдзеле ў беспарадках у дэпартаменце Сена-Сен-Дэні на поўначы Парыжа. Жыхары дэпартамента чацвёртую ноч выходзілі на акцыі пратэсту супраць паліцэйскага самавольства ў сувязі з інцыдэнтам, які адбыўся ў камуне Оне-су-Буа на мінулым тыдні. Чацвёртая ноч беспарадкаў закранула не толькі камуны, дзе адбыўся інцыдэнт, але і суседнія паселішчы.




### «Гіві» забілі з агнямёта

Вядомы камандзір батальёна данецкіх апалчэнцаў «Самалі» Міхаіл Талстых (пазыўны «Гіві») быў забіты ва ўласным кабінеце ў прыгарадзе Данецка. Ён загінуў у выніку атакі з рэактыўнага пяхотнага агнямёта «Чмель». Пасля забойства Талстых у рэспубліцы былі ўзмоцнены меры бяспекі і ўведзены план «Перахоп». У міністэрстве дзяржбяспекі рэкамендавалі жыхарам праяўляць спакой і не паддавацца паніцы, а ў выпадку выяўлення падазроных асоб неадкладна паведамляць у экстранныя службы. Узбуджаная крымінальная справа па артыкуле «Тэракт».

### Парламент Шатландыі прагаласаваў супраць «брэксіту»




Парламент Шатландыі прагаласаваў супраць плана прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Тэрэзы Мэй па выхадзе краіны з Еўрасаюза. Нягледзячы на тое, што галасаванне не мае юрыдычнай сілы і з'яўляецца сімвалічным, Эдынбург яшчэ раз нагадаў Лондану пра сваё нежаданне падпарадкоўвацца агульнанацыянальнаму плану па «брэксіту». Кіраўнік мясцовага ўрада Нікола Стэрджэн не раз заяўляла пра намер правесці паўторны плебісцыт па пытанні самавызначэння Шатландыі. Эдынбург спадзяецца атрымаць больш аўтаноміі і захаваць максімум эканамічных пераваг у рамках адзінага еўрапейскага рынку.

# КАЛЯНДАР СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ

**9 лютага, чацвер.** Мабыць, самы ўдалы дзень для стрыжкі. Вырашацца фінансавыя праблемы і непаразуменні з блізкімі.

**10 лютага, пятніца.** Абавязкова абстрыжыце канцы валасоў, каб прыцягнуць новую станоўчую энергію.

**11 лютага, субота.** Выдатны дзень для кардынальнай змены іміджу. Можаце коратка абстрыгчы валасы і пафарбаваць у яркі колер.

**12 лютага, нядзеля.** Калі пачаліся праблемы са здароўем — стрыжка сёння дапаможа іх вырашыць.

**13 лютага, панядзелак.** Стрыжка атрымаецца неймаверна прыгожай.

**14 лютага, аўторак.** Не стрыжыце валасы, калі не хочаце прыцягнуць бяду. Афарбоўка забароненая, укладка толькі ў хатніх умовах.

**15 лютага, серада.** Стрыжка будзе доўга трымаць форму, а таксама дапаможа вам паверыць у свае сілы. Валасы не фарбаваць.

**16 лютага, чацвер.** Згодна з месяцавым календаром стрыжка прынясе поспех у справах.

**17 лютага, пятніца.** Калі ёсць праблемы са здароўем — у цырульню. Таксама вырашацца і фінансавыя праблемы. Фарбаваць валасы можна ў светлы колер.

**18 лютага, субота.** Коратка стрыгчыся нельга, лепш проста падрэзаць кончыкі. Стрыжка прыцягне энергію здароўя і грошай. Мінімум тры разы за дзень расчэсвайце валасы.

**19 лютага, нядзеля.** Сёняшняя стрыжка можа прынесці толькі негатыўныя наступствы як з боку здароўя, так і з боку адносін.

**20 лютага, панядзелак.** Сёння стрыгчыся можна, прычоска доўга будзе трымаць форму, бо Месяц убывае. Фарбавацца можна ў цёмныя тоны натуральнымі фарбавальнікамі.



**21 лютага, аўторак.** Валасы пасля стрыжкі стануць густымі і паслухмянымі.

**22 лютага, серада.** Адкладзіце стрыжку, каб не ўпасці ў дэпрэсію. А вось усе працэдуры па доглядзе валасоў сёння прынясуць станоўчы вынік.

**23 лютага, чацвер.** Калі хочаце стаць больш паспяховымі, абаяльнымі, прывабнымі, павысіць папулярнасць і сваё матэрыяльнае становішча, то гэта самы ўдалы дзень для стрыжкі.

**24 лютага, пятніца.** Хочаце змяніць жыццё — коратка пастрыжыце валасы. Сёння можна кардынальна мяняць прычоску.

**25 лютага, субота.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі. Сёння лепш наогул не чапаць валасы.

**26 лютага, нядзеля.** Любыя маніпуляцыі з валасамі проціпаказаныя. Расчашыце і зрабіце самую простую паўсядзённую ўкладку.

**27 лютага, панядзелак.** Стрыжка прынясе гора і хваробы. Афарбоўка толькі ў натуральны колер валасоў.

**28 лютага, аўторак.** Афарбоўванне і стрыжка забароненыя. Наведванне цырульні адкладзіце на іншы дзень, калі не хочаце сустракаць беды на парозе. Яны прыйдуць доўгай чарадой

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| **Мінск —** | 8.41 | 18.07 | 9.26 |
| **Віцебск —** | 8.35 | 17.53 | 9.18 |
| **Магілёў —** | 8.31 | 17.57 | 9.26 |
| **Гомель —** | 8.23 | 17.58 | 9.35 |
| **Гродна —** | 8.56 | 18.23 | 9.27 |
| **Брэст —** | 8.52 | 18.28 | 9.36 |

## Месяц

***Поўня 11 лютага.***
***Месяц у сузор'і Льва.***

## Імяніны

***Пр.*** *Івана.*
***К.*** *Апалоніі, Бярнарды, Сабіны, Бярнарда, Кірылы, Раймунда, Эрыка.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## ■ Запрашальнік

### J:МОРС заклікае на «бязвізавы канцэрт»



Свой першы ў гэтым годзе канцэрт адзін з самых папулярных беларускіх гуртоў дасць у Мінску акурат у Дзень усіх закаханых, 14 лютага. Але анансуюць яго музыканты зусім іншым чынам. Будучае выступленне рэкламуецца ў інтэрнэце... на 10 мовах краін, грамадзяне якіх з 12 лютага могуць прыехаць у Беларусь без візы. Гурт звяртаецца да патэнцыйных слухачоў на англійскай, польскай, іспанскай, італьянскай, нямецкай, французскай, галандскай, шведскай, а таксама на арабскай і кітайскай мовах.

Як запэўнівае лідар калектыву Уладзімір Пугач, у «J:Морс» даволі многа прыхільнікаў у розных краінах свету, і навіна пра бязвізавы рэжым прыйшлася ім даспадобы. «Шэраг маіх знаёмых даўно хацелі прыехаць на наш канцэрт, але з улікам віз гэта каштавала б, мабыць, як на ажылага Луі Армстранга», — жартуе артыст. Наогул жа кошт білетаў на канцэртную праграму «Блізка», куды ўвайшлі самыя цёплыя і рамантычныя песні калектыву, вагаецца ад 35 да 60 рублёў.

### «Песні свету» Марыны Васілеўскай

Ці можна пачуць у адным «камплекце» хіты Ціны Цёрнэр, Элы Фіцджэральд і Уітні Х'юстан, пазнавальныя з першых нот кампазіцыі вядомых рок-гуртоў «Europe» і «Deep Purple», рамантычныя мелодыі «ABBA» и «Roxette»? Лёгка — 17 лютага на сцэне Белдзяржфілармоніі ў выкананні эстрадна-джазавай спявачкі Марыны Васілеўскай, Нацыянальнага аркестра імя І. Жыновіча і рок-гурта



«Denver», а таксама лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Ігара Задарожнага і Андрэя Коласава.

Паводле слоў самой спявачкі, заставацца ў адным толькі жанры папулярнай эстраднай песні — сумна і нецікава, бо хочацца развівацца ў розных кірунках. Таму для сваёй сольнай праграмы артыстка выбрала любімыя песні легендарных сусветных калектываў і выканаўцаў папулярнай, джазавай і рок-музыкі. «Кожны чалавек, які прыйдзе на канцэрт, не толькі пачуе стапрацэнтна жывы гук, але і атрымае пазітыўны зарад — прынамсі, мы ўсе для гэтага вельмі пастараемся!» — абяцае Марына.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## УСМІХНЕМСЯ

**Дасталі маразы.**
**Здымала з вешалкі бялізну, зламала любімую сукенку...**

— Як жа хочацца веселосці, віна, вар'яцкага сексу! Дзяўчаты, выклікайце таксі!

— Каця, ты вельмі пераацэньваеш таксістаў.

**Дзве стадыі жыцця.**
**Да 18 гадоў.**
**Ты школьнік і думаеш, што ў кватэрах з фіялетавым святлом у вокнах адбываецца нешта.**
**Пасля 18.**
**Ты ведаеш, што там расада.**

Што датычыцца вегетарыянства. Чулі вы калі-небудзь, каб пра недахоп разумовых здольнасцяў казалі: тупы леў, дурная пантэра, ну ты гепард!

Не?

А пра карову, авечку, барана?




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

## Даты | Падзеі | Людзі

**9 ЛЮТАГА**

**1547** год — нарадзіўся Хрыстафор Радзівіл, ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Удзельнік Лівонскай вайны (1558—1583). З 1584 года — ваявода віленскі. Пасля смерці Стэфана Баторыя падтрымліваў план часткі магнатаў і шляхты ВКЛ выбраць каралём расійскага цара Фёдара Іванавіча і стварыць дзяржаўную унію Польшчы, ВКЛ і Расіі на чале з Вялікім Княствам Літоўскім. З 1589 года — вялікі гетман ВКЛ. Памёр у 1603 годзе.

**1667** год — у вёсцы Андросава, на мяжы Мсціслаўскага і Смаленскага ваяводстваў, прадстаўнікамі Расіі на чале з А.Л. Ардын-Нашчокіным і Рэчы Паспалітай на чале з Ю. Глябовічам было падпісана так званае Андросаўскае перамір'е, якое завяршыла вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гадоў. Згодна з дагаворам, да Расіі адышлі Смаленскае і Чарнігаўскае ваяводствы з гарадамі, а таксама гарады Веліж і Невель Віцебскага, г. Себеж Полацкага ваяводстваў. Рэч Паспалітая прызнала далучэнне Левабярэжнай Украіны да Расіі. Насельніцтву Беларусі і Правабярэжнай Украіны ў складзе Рэчы Паспалітай гарантавалася свабода праваслаўнага веравызнання. Андросаўскае перамір'е стала пачаткам саюза Рэчы Паспалітай і Расіі супраць Турцыі і Крымскага ханства. Яго ўмовы пацверджаны «Вечным мірам» (1686 г.).

**1852** год — у Мінску ўпершыню пастаўлена опера «Ідылія» («Сялянка») на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча. Гэты своеасаблівы оперна-драматычны твор быў напісаны ў 1842—1844 гадах. Музыку да тэксту напісалі сябры Дуніна-Марцінкевіча — кампазітар С. Манюшка і скрыпач К. Кржыжаноўскі. Прэм'ера адбылася на сцэне Мінскага гарадскога тэатра, і на тэатральных падмостках адкрыта загучала беларускае слова. Пастаноўка оперы на сцэне атрымала шырокі грамадскі рэзананс і ашаламляльны поспех у гледачоў. Аднак першае адкрытае прадстаўленне «Ідыліі» аказалася і апошнім. З боку афіцыйных улад прыйшла катэгарычная забарона выступлення на «простанароднай мове». Трупе давялося даваць спектаклі нелегальна на прыватных кватэрах у Слуцку, Бабруйску, Глуску і Мінску. І тым не менш дзень прэм'еры оперы ўвайшоў у гісторыю айчыннага тэатральнага мастацтва як дзень нараджэння беларускага тэатра.

**1887** год — нарадзіўся Васіль Іванавіч Чапаеў (1887—1919), легендарны камдзіў часоў Грамадзянскай вайны. З 1918 года — камандаваў атрадам, брыгадай і 25-й стралковай дывізіяй, якая выканала значную ролю ў разгроме войск адмірала А.В. Калчака летам 1919 г. Загінуў у баі. Вобраз Чапаева адлюстраваны ў рамане Д.А. Фурманава «Чапаеў» і аднайменным фільме, які выйшаў на экраны ў 1934 годзе. У нашай краіне яго імем названы вуліцы, калгасы і саўгасы. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі яго імя насілі 7 партызанскіх брыгад і дзясяткі атрадаў.



**Было сказана**

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**
*«Узросту не мае Гармонія,*
*Не ведае межаў Краса».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 613.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 8 лютага 2017 года.